

ПАКІНУЦЬ ЦІ ЗАКРЫЦЬ ФАПЫ?

МС

СКУЛЬПТАР З КЛІМАВІЧ

МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 МАЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 90 (28957)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**
*«Здароўе дзяцей і падлеткаў вызначае цэлы шэраг фактараў. Гэта спрыяльная атмасфера і бяспека ў сям'і, установах адукацыі, культуры, спорту, на вуліцы, даступнасць медыцынскіх, сацыяльных паслуг, здаровае харчаванне, добрыя ўмовы для заняткаў фізічнай культурай і спортам, інфармацыйная бяспека і многае іншае. У нашай краіне па ўсіх гэтых кірунках вядзецца комплексная міжведамасная работа. Разам з тым у гэтым пытанні, на жаль, яшчэ досыць вузкіх месцаў, і без зладжаных сумесных дзеянняў іх не вырашыць. Тут важная дакладна скаардынаваная праца органаў аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту, МУС, МНС, актыўнае ўключэнне ў яе бацькоў. Неабходная максімальная інфармацыйная падтрымка ў СМІ, інтэрнэце. Не павінны заставацца ўбаку і грамадскія, маладзёжныя арганізацыі».*

# «ЗВЯЗДА» ПРЫНЯЛА ЭСТАФЕТУ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Эстафета агню «Полымя міру» завяршае сваё падарожжа па Брэсцкай вобласці. Учора агонь II Еўрапейскіх гульняў пабываў на адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны — на рэспубліканскім унітарным вытворчым прадпрыемстве «Граніт». Туды ён трапіў з дапамогай карэспандэнта «Звязды» Дар'і ЛАБАЖЭВІЧ. З факелам Гульняў яна спусцілася ў адзін з найбуйнейшых кар'ераў у Еўропе, дзе здабываюць граніт, дыяруць і гранадыярыт.

## КОРАТКА

• Індыя гатова інвеставаць $10 млн у эканоміку Віцебскай вобласці.

• МАРГ: пасажыр таксі мае права адмовіцца ад аплаты паездкі з выключаным таксометрам.

• МПЗ не выключае ўвядзення новых абмежаванняў па размяшчэнні казіно ў Беларусі.

• У нашай краіне створана вытворчасць стралковай зброі і боепрыпасаў.

• У Нацыянальным музеі-запаведніку «Нясвіж» у Ноч музеяў 18 мая адбудзецца шоу «Прыезд караля».

ISSN 1990 - 763X

# СВАБОДНЫХ КВІТКОЎ УСЁ МЕНШ

## Што рабіць тым, хто яшчэ не набыў білеты на Гульні

**Да старту II Еўрапейскіх гульняў засталося крыху больш за месяц. Яшчэ ў красавіку арганізатары паведамлялі: продажы ідуць бадзёра, вольных месцаў усё менш і менш. Таму аматарам спорту і відовішчаў, якія дагэтуль не набылі білеты, варта паспяшацца.**

Іх можна набыць у пунктах продажу партнёрскай сеткі Ticketpro альбо на сайце minsk2019.ticketpro.by. На спецыяльнай старонцы ў рэжыме анлайн можна выбраць дату, від спорту і месцы на спартыўнай арэне. Пры гэтым арганізатары адзначаюць, што віртуальную версію білета можна абмяняць у пунктах продажу на маляўнічую папяровую.

Асобную білетную праграму склалі для балельшчыкаў з абмежаванымі магчымасцямі. Набыць квіток на спецыяльна падрыхтаваныя для гэтых мэт месцы можна са значнай зніжкай. Пры гэтым на ўваходзе ў арэну папросяць пасведчанне аб інваліднасці.

Кошт білетаў залежыць ад віду спорту і ўзроўню спаборніцкай сесіі. Але самыя танныя — па 5-10 рублёў — проста зараз знайсці ўжо вельмі цяжка. Таму прыйдзецца раскашэліцца крыху больш. Ужо дакладна вядома, што фінальныя спаборніцтвы самых рэйтынгавых відаў спорту збяруць аншлаг: ніводнага свабоднага білета на гэты момант не засталося.

Не выключана, што пэўная іх колькасць яшчэ можа стаць даступнай пасля таго, як з іх будзе знятая бронь.

Пры гэтым кожны ахвотны ўсё яшчэ можа стаць часткай маляўнічага і маштабнага шоу падчас цырымоній адкрыцця і закрыцця. Сустрэча галоўнага спартыўнага свята года пацягне на 150—300 рублёў. Развітацца з ім будзе ўдвая танней — 70—150 рублёў.

**Дзмітрый СУГАНЯЕЎ.**

Экалагічны досвед

# КЛОПАТ НЕ ЯНОТА, А ЭКАБОТА

## Чэкі і фотаздымкі — не макулатура, а люстэрка і крышталь — не шклатара

**Падказкі пра тое, што варта, а што бессэнсоўна збіраць асобна, можна знайсці ў віртуальных смеццевых кантэйнерах на старонцы Irecycle.by. А каб упэўніцца, што ўпакоўка, якую вы збіраецеся выкінуць асобна, гэта сапраўды папера, шкло ці пластык, можна ўдакладніць у экабота. Такі сайт з анлайн-інструкцыяй па абыходжанні з адходамі стварылі спецыялісты Цэнтра экалагічных рашэнняў з дапамогай Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў.**

### Пазбавіцца аднаразовага стылю жыцця

Хоць для Беларусі падобная ідэя новая, за мяжой такія сайты дапамагаюць камунальным службам інфармаваць насельніцтва, што рабіць з адходамі. Айчынны інтэрнэт-рэсурс рабілі па прыкладзе сайта экалагічнага дэпартамента Сан-Францыска (ЗША), які паспяхова развіваецца ў кірунку Zero waste (нуль адходаў), расказаў **Яўген ЛАБАНАЎ, дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў**:




Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Мы спадзяёмся, што Irecycle.by стане зразумелым і даступным рэсурсам. Многія, магчыма, перагледзяць свае звычкі, калі ўбачаць, колькі матэрыялаў ідзе проста на звалку. А яшчэ інфармацыя з сайта дазволіць людзям зрабіць свядомы выбар і адмовіцца ад неперапрацоўваемых і аднаразовых тавараў.

СТАР. 4

# НЕ ГУБЛЯЦЬ, А РАЗВІВАЦЬ

## Прэзідэнт правёў кадравыя перастаноўкі

**Новыя людзі з'явіліся не толькі ў кіраўніцтве мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дыппрадстаўніцтве і рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, але і ў кіраўніцтве важных арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў і Нацыянальнай акадэміі навук.**

### ЗМЕНЫ Ў МЯСЦОВАЙ ВЕРТЫКАЛІ

Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў прызначэнне Віталя Кулака на пасаду старшыні Жабінкаўскага райвыканкама. Раней ён з'яўляўся старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама.

На пасаду старшыні Пружанскага райвыканкама ўзгоднены Юрый Бісун, які раней працаваў старшынёй Іванаўскага райвыканкама. У сваю чаргу, гэтую пасаду заняў Анатоль Ткачук, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, для чаго патрэбна ратацыя старшыні з аднаго райвыканкама ў іншы райвыканкам. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава адзначыла, што гэта пытанне абмяркоўвалася з губернатарам Брэсцкай вобласці, і ахарактарызавала Юрыя Бісуна як моцнага кіраўніка, вопыт якога сёння патрэбны ў Пружанах для таго, каб раён развіваўся больш дынамічна.

Аляксандр Лукашэнка запытаў пра сітуацыю ў Брэсцкай вобласці па сельскай гаспадарцы. Віталь Кулак далажыў, што работы на плошчах, запланаваных пад сяўбу яравых культур, у цэлым па вобласці завершаны (з улікам умоў надвор'я). Ужо прыступілі да нарыхтоўкі кармоў, рыхтуюць свірэпіцу і азімае жыта на сілас. Што датычыцца травяных кармоў, з-за ўмоў надвор'я яны яшчэ не нараслі, літаральна з наступнага тыдня плануюць пачаць нарыхтоўку.

Таксама беларускі лідар пацікавіўся сітуацыяй у вобласці ў раслінаводстве. Яго праінфармавалі, што былі складанасці па вільгаці, але сітуацыя паправілася дзякуючы даждам на тэрыторыі ўсяго рэгіёна. Да таго ж спецыялісты своечасова рэагуюць па сітуацыю — дзесьці перасейваюць, каб кожны гектар зямлі выкарыстоўваўся максімальна прадукцыйна. Прэзідэнт звярнуў увагу, што з мінулага года былі зроблены высновы, таму за гэты і, магчыма, будучы год трэба аднавіць запасы кармоў і збожжа. «Трэба, каб былі запасы. Усё можа быць, клімат памяняўся», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што трэба адаптавацца і шукаць новыя культуры для атрымання эканамічнай эфектыўнасці.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы думае аб тым, што, можа, нам і не варта фарсіраваць павелічэнне вытворчасці мяса і малака, таму што прадаць яго не так проста. Безумоўна, калі будзе вялікі попыт у свеце, то асобныя пазіцыі (свініна, птушка) можна будзе нарасціць. Пакуль жа відавочна, што на традыцыйных рынках для Беларусі працаваць складана. «Гэта сур'ёзныя пытанні, і нам трэба сур'ёзна абмяркоўваць на ўзроўні ўрада гэтую праблему, — сказаў Прэзідэнт.

Таксама беларускі лідар нагадаў прысутным, што ў Беларусі — два палітычныя гады, час выбарчых кампаній. Гэтым займаюцца ў тым ліку і старшыні райвыканкамаў. Паводле яго слоў, трэба, каб усё прайшло годна, умовы для гэтага ёсць.

### НОВЫЯ КІРАЎНІКІ Ў АРГАНІЗАЦЫЯХ

На пасаду старшыні Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці беларускі лідар узгадніў прызначэнне Тацццяны Лугіной. Да гэтага яна працавала генеральным дырэктарам ААТ «Пінскае прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе».

Што датычыцца згаданага канцэрна, то беларускі лідар адзначыў, што сёння наша краіна, якая ў савецкія часы валодала развітой лёгкай прамысловасцю, увозіць «рознага роду рыззё» з-за мяжы, паколькі сама выраблець не можа.

«Вядома, будзе няпроста падняць гэты пласт, але вы заўсёды можаце разлічваць у тым ліку і на маю падтрымку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і заклікаў агучваць праблемы, у тым ліку паведамляць у Адміністрацыю Прэзідэнта.

Генеральным дырэктарам ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» стаў Валерый Іванковіч, раней — генеральны дырэктар ААТ «АМКАДОР».

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне Рыгора Ванькова на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Кіруючая кампанія холдынга» Лідсельмаш». Да гэтага ён узначальваў вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Амкадор-ДОМЗ».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці не аслабіць «АМКАДОР» пераход двух яго моцных супрацоўнікаў. Наталля Качанава адзначыла, што на гэтым прадпрыемстве добрая пераемнасць, таму замена ёсць. Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць ратацыі, каб людзі ўжывалі свой вопыт на розных пазіцыях.

МАЗ, БелАЗ і МТЗ Прэзідэнт назваў тварам нашай краіны і тварам беларускага аўтамабілебудавання. Аляксандр Лукашэнка таксама анансаваў свой візіт на МАЗ у гэтым годзе.

Аляксей Кушнарэнка стаў генеральным дырэктарам дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз», да гэтага ён узначальваў «Магілёўаблгаз». Прэзідэнт адзначыў, што тут асаблівых праблем няма, проста патрэбны парадак і арганізацыя. Ён заклікаў не губляць неабходнае, аднак не трымаць лішняе.

Аляксандр Даўгала стаў генеральным дырэктарам кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская цэментная кампанія». Раней ён працаваў начальнікам упраўлення будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі апарату Савета Міністраў.

Паводле слоў беларускага лідара, тут сітуацыя як з кампаніяй «МАЗ»: трэба выцягнуць сферу цэментнай вытворчасці. Якая тут самая вялікая праблема? Па словах Аляксандра Даўгалы, гэта выкананне абавязацельстваў па крэдытах. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што больш ніхто падтрымліваць цэментную прамысловасць не будзе, так што трэба шукаць напрамкі рэалізацыі цэменту, каб пастуова вяртаць крэдытныя сродкі.

«Так, мы накіроўваем вас на няпростыя ўчасткі работы. Вельмі няпростыя, але цікавыя, і працаваць там можна — працаваць эфектыўна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### ЗМЕНЫ Ў ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

Прэзідэнт узгадніў прызначэнне на пасаду рэктара ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» Вячаслава Шуціліна, раней — першага прарэктара гэтай навучальнай установы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: трэба рыхтаваць беларускіх студэнтаў для айчыннай эканомікі. Ён звярнуў увагу, што па заканчэнні выпускнікі павінны прыходзіць на адпаведнае кваліфікацыі месца працы. Таксама Аляксандр Лукашэнка заклікаў больш шырока паглядзець на развіццё гэтага ўніверсітэта.

Віталь Веліканаў стаў рэктарам Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Да гэтага ён працаваў прарэктарам па выхаваўчай рабоце ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

Аляксандр Лукашэнка назваў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ўнікальнай навучальнай установай. Работы там будзе нямала, у тым ліку па добраўпарадкаванні тэрыторыі, дадаў ён.

Абмяркоўвалася вяртанне акадэміі навучальнай гаспадаркі — Віталь Веліканаў падкрэсліў яе важнасць у кантэксце практычнай падрыхтоўкі студэнтаў, выкладчыкаў і навукоўцаў. «Першае паўгоддзе гэтага года — пытанне павінна быць закрыта», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Беларускі лідар задаў лагічнае пытанне: якім чынам навучаць студэнтаў рабоце на зямлі, калі рабіць гэта няма дзе?

### НАВУКОЎЦЫ, БУДАЎНІКІ, ДЫПЛАМАТЫ

Таксама адбыліся прызначэнні і ўзгадненні ў рабочым парадку.

Намеснікам старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прызначаны Аляксандр Кільчэўскі, раней — галоўны вучоны сакратар акадэміі. У сваю чаргу, гэтую пасаду заняў Андрэй Іванец, які да гэтага працаваў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі.

На пасаду генеральнага дырэктара навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве ўзгоднены Вадзім Маханько, раней — намеснік гендырэктара па навуковай рабоце гэтага прадпрыемства.

На пасаду першага намесніка міністра архітэктуры і будаўніцтва ўзгоднены Ігар Касцюкоў, да гэтага ён займаў пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

Аляксей Ананіч стаў намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва. Раней ён працаваў намеснікам дырэктара па эканоміцы ў «Мінскпраекце».

Ігар Фісенка — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі і па сумяшчальніцтве Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ЮНЕСКА — прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Пасломі Беларусі ў Манака і Партугаліі па сумяшчальніцтве.

На пасаду члена Віцебскага аблвыканкама ўзгоднены начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Міхаіл Грыб, на пасаду члена Мінскага аблвыканкама — першы сакратар Мінскага абласнога камітэта грамадскага аб'яднання «БРСМ» Кірыл Шык, а на пасаду члена Мінскага гарвыканкама — начальнік галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама Іван Кубракоў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

---

Парламенцкі дзённік

# Бяздымнае асяроддзе і аўтазарадка на падворку

**Дэпутаты прынялі праекты законаў: важна для курцоў, прадаўцоў і аматараў азартных гульняў.**

Асобам маладзейшым за васямнаццаць гадоў забароняць набываць вадкасці для электронных сістэм курэння. На прылады распаўсюджаны забароны, што дзейнічаюць для тытунёвых вырабаў у частцы месцаў іх продажу. Такія асобныя прававыя нормы ўстанаўліваюцца Дэкрэтам Прэзідэнта, які карэкціруе адпаведныя дакументы.

«Ва ўсім свеце, у тым ліку і ў нашай краіне, культывуецца здаровы лад жыцця. Адна са значных задач — пазбаўленне насельніцтва ад тытунёвай залежнасці. У Беларусі праводзіцца мэтанакіраваная барацьба з курэннем, якая ўключае паслядоўнае абмежаванне даступнасці тытунёвай прадукцыі і яе рэкламы, медыцынскую і кансультацыйную дапамогу», — заўважыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА перад разглядам гэтага пытання.**

Дэпутаты абмеркавалі і праект закона, які прадугледжвае ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне патрабаванняў аб абавязковым заключэнні здзелкі на біржавых таргах. Законапраект распрацаваны для ўзмацнення кантролю за рэалізацыяй прадукцыі, якая адносіцца да стратэгічна важнай для эканомікі краіны. Бо, як адзначыў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ**, за першае паўгоддзе 2018 года вываз з краіны малочнай прадукцыі па-за біржавымі таргамі склаў 38,8 % агульнага аб'ёму экспарту малака, прычым прадаваўся тавар на 15 % танней за рэкамендаваны кошт. З парушэннем здзейснены здзелкі і па іншых пазіцыях. Адказнасць, прадугледжаная ў законапраекце, мае, перш за ўсё, папераджальны характар. А паўторнае парушэнне цягне штраф у памеры да 50 базавых велічынь.

Іншы законапраект прадугледжвае пакаранне за допуск у гульнявую ўстанову, у тым ліку віртуальную, ці да ўдзелу ў азартных гульнях людзей, звесткі пра якіх унесены ў пералік асоб, абмежаваных у наведванні такіх устаноў і ўдзеле ў падобных гульнях. Дарэчы, наведваць рэальныя і віртуальныя гульнявыя ўстановы цяпер дазваляецца не з 18, а ўжо з 21 года.

У праекце закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб зямлі сярод іншага прадугледжана магчымасць аднячасова выкарыстоўваць земельныя ўчасткі па мэтавым прызначэнні і для ўстаноўкі зарадных станцый для электрамабіляў, ажыццяўлення іх зарадкі.

Таксама на ўчарашнім пасяджэнні дэпутаты прынялі рашэнне аб вызваленні Андрэя Навумовіча з пасады старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. Ён з красавіка працуе начальнікам Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў. Старшынёй камісіі абрана Валянціна Ражанец, якая дагэтуль займала пасаду намесніка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

---

Нестандартны падыход

# ПРЫДУМАЎ, РАСПРАЦАВАЎ? АБАРАНІ!

**Першы маладзёжны конкурс стартапаў «StartUp Heart» пройдзе 17 мая на пляцоўцы Парка высокіх тэхналогій.**

За галоўны прыз пазмагаюцца распрацоўшчыкі 28 праектаў. Аўтарамі ініцыятыў з'яўляюцца старшакласнікі і маладыя спецыялісты з Мінскай, Гомельскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Свае рашэнні прадэманструюць таксама студэнты БДУ, БДУІРа, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Сярод праектаў, што выйшлі ў фінал, прафарыентацыя ў віртуальнай рэальнасці «Праф VR» ад магістранта БДУІРа Дзмітрыя Дубініна. Яго ініцыятыва прадугледжвае віртуальнае мадэляванне прафесійнага асяроддзя, у якім кожны ахвотны зможа «прымерыць» на сябе ролю таго ці іншага спецыяліста. Другакурснік эканамічнага факультэта БДУ Аляксандр Уласевіч прадставіць праект «Акваponіка». Увогуле студэнты Белдзяржуніверсітэта прадставяць у фінале пяць сваіх стартапаў.

Канкурсантам трэба будзе прэзентаваць праекты з дэталізаваным бізнес-планам, які ўключае задачы, каштарыс і меркаваны тэрмін рэалізацыі. Абарона будзе праходзіць перад патэнцыйнымі інвестарамі, якія ацэняць значнасць і эфектыўнасць стартапаў.

Найлепшыя распрацоўкі вызначаць у 16 намінацыях: «Фінансавыя і адукацыйныя тэхналогіі», «Разумны горад», «Дапоўненая і віртуальная рэальнасць», «Штучны інтэлект і машыннае навучанне», «Сацыяльнае прадпрымальніцтва» і іншых. Галоўным прызам стане фінансавая падтрымка для прасоўвання праекта. Таксама члены каманды, якая пераможа, атрымаюць магчымасць прайсці навучанне ў адной з найбуйнейшых IT-кампаній Беларусі.

Усяго ў адборачных турах конкурсу было разгледжана каля 40 праектаў. Арганізатарам конкурсу выступіў эканамічны факультэт БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЕВЫПАДКОВАЯ ПЛЯЦОЎКА

## У Беларусь з'ехаліся найлепшыя тэрапеўты з 12 краін свету

**У гэтыя дні ў Мінску праходзіць V Міжнародны з'езд Еўразійскай асацыяцыі тэрапеўтаў. У ім удзельнічае каля 2,5 тысячы медыкаў з 12 краін свету.**



Фота БелТА.

Наша краіна невыпадкова стала пляцоўкай такога прадстаўнічага міжнароднага форуму. **Міністр аховы здароўя Беларусі Валерый МАЛАШКА**, расказваючы пра дасягненні айчыннай медыцыны, падкрэсліў, што летась паказчык агульнай смяротнасці склаў 12,6 праміле, узровень нараджальнасці — 10 праміле. Смяротнасць немаўлят дасягнула самага нізкага ўзроўню за ўсю гісторыю назіранняў — 2,4 праміле. Чаканая працягласць жыцця зараз складае 74,4 года. Доля пацыентаў з выяўленымі на ранніх, 1—2 стадыях, ракавымі пухлінамі вырасла да 78 %. Удалося знізіць смяротнасць ад туберкулёзу — да 2,4 выпадка на 100 тысяч чалавек. Летась праведзена 18 тысяч аперацый на сэрцы і сасудах, выканана 41 трансплантацыя сэрца. Беларусь знаходзіцца на 10-м месцы ў свеце па колькасці донараў, а таксама па трансплантацыі ныркі.

— Сёння мы ідзём па шляху даступнасці сістэмы аховы здароўя, у тым ліку і высокіх тэхналогій. Міністэрства закупляе ўсе неабходныя прэпараты, якія ўваходзяць у сучасныя пратаколы лячэння, а таксама расходныя матэрыялы, вырабы медыцынскай тэхнікі, якія неабходны для правядзення высокатэхналагічных аперацый у кардыялогіі, неўралогіі, нейрахірургіі. У транспланталогіі, кардыяхірургіі мы займаем высокія пазіцыі ў свеце і падтрымліваем сістэму аховы здароўя на дастаткова высокім узроўні, — адзначыў міністр.

Закранаючы пытанне рэфармавання тэрапеўтычнай службы, дзе адбываецца паступовы пераход да ўрачоў агульнай практыкі, Валерый Малашка паведаміў, што ўжо летась доля гэтых спецыялістаў складала 60 %.

Як растлумачыў **член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, прафесар Рыгор АРУЦЮНАЎ**, мэта форуму — абмен перадавымі тэхналогіямі, якія сталі рэальнасцю клінічнай практыкі. Адно з галоўных пытанняў — камарбідны пацыент, які мае некалькі хвароб, што ўплываюць адна на адну. Дыягнаставаць і лячыць камарбідны стан — важная задача сучаснай тэрапіі.

— Два дзесяцігоддзі таму да нас прыязджалі японскія і канадскія калегі і дапамагалі асвойваць новыя тэхналогіі. А сёння яны прыязджаюць для абмену вопытам. Нядаўна прэзідэнт універсітэта японскага горада Акіта сказаў, што ім ёсць чаму ў нас павучыцца. Гэта самая высокая пахвала, — падзялілася **доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры кардыялогіі і ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ**. — Узровень нашых інтэрвенцыйных, кардыяхірургічных тэхналогій і тэхналогій у галіне трансплантацыі сэрца не проста выклікае цікавасць за мяжой, а садзейнічае таму, што нашых спецыялістаў запрашаюць на майстар-класы ў буйныя кардыялагічныя цэнтры Еўропы і Азіі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Бачыць пажары хутка будзе беспілотнік «Буравеснік»

**Прычына буйных лясных пажараў у пачатку вясны — адсутнасць дажджоў і моцны вецер**

**Пра гэта паведаміў выконваючы абавязкі начальніка цэнтра авіяцыйнай аховы лясоў дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай установы «Авіяцыя» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Ігар ЗМІТРЭНЯ.**

Пажары ў лясах і на тарфяніках штогод наносяць немалы ўрон дзяржаве. Яны характарызуюцца не толькі значнай матэрыяльнай і экалагічнай шкодай, але і прыцягненнем на іх ліквідацыю вялікай колькасці персаналу і спецыяльнай тэхнікі.

Так, паводле звестак МНС, у 2018 годзе ліквідавана 1965 лясных і тарфяных пажараў на плошчы больш за 1400 гектараў. Пры тушэнні пажараў у экасістэмах было задзейнічана 7970 работнікаў МНС і 2870 адзінак тэхнікі.

Для адшукання такіх пажараў выкарыстоўваюцца розныя віды маніторынгу, у тым ліку касмічны і авіяцыйны. На тэрыторыі краіны дыстанцыйнае зандаванне зямлі праводзіцца з дапамогай касмічных апаратаў розных тыпаў. «Авіяцыйны маніторынг ажыццяўляе наша авіяцыйная аварыйна-выратавальная ўстанова. У асноўным ажыццяўляем патруляванне па запланаваных маршрутах. Выстаўлена 12 паветраных судоў для авіяпатрулявання», — растлумачыў Ігар Змітрэня.

Сёлета спецыялістамі гэтай службы быў выяўлены 21 лясны пажар. З дапамогай дэсантна-пажарнай службы яны патушылі дзевяць лясных пажараў. Буйныя пажары былі на поўдні краіны. Многія пажары прыходзілі з Украіны і Расіі.

Вялікую ролю ў тушэнні заданых пажараў адыгралі паветраныя судны авіяцыі, якія на сённяшні дзень з'яўляюцца самымі эфектыўнымі і аператыўнымі сродкамі ў справе папярэджвання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару.

Супрацьпажарную работу выконвае беспілотнік «Бусел-М» з радыусам дзеяння каля 25 кіламетраў, а хутка ў арсенале арганізацыі ДААВУ «Авіяцыя» з'явіцца новы распрацаваны ў Акадэміі навук Беларусі апарат — «Буравеснік» з радыусам дзеяння 75 кіламетраў. Засталося толькі скончыць яго прыёмачнае выпрабаванне. Распрацоўшчыкі плануюць перадаць яго для практычнага прымянення ратавальнікамі ўжо ў канцы гэтага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інаўгурацыя Уладзіміра Зяленскага пройдзе 20 мая

Вярхоўная Рада Украіны вызначыла дату правядзення інаўгурацыі новаабранага прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага. Як паведаміў партал «Громадське», яна адбудзецца 20 мая ў 10.00. Гэтую прапанову падтрымалі 315 дэпутатаў, двое былі супраць. Напярэдадні ў парламент Украіны ўнеслі сем праектаў, якія датычацца меркаванай даты інаўгурацыі, тры з якіх прапаноўвалі правесці інаўгурацыю 19 мая. У астатніх чатырох прапаноўваліся 17 мая, 20 мая, 26 мая і 27 мая. Сам Зяленскі настойваў на 19 мая: яго палітсаветнік Дзмітрый Разумкоў патлумачыў гэта жаданнем пазбегнуць транспартнага калапсу, звязанага з прыездам замежных гасцей і абмежаваннямі руху. Дэталі цырымоніі, а таксама спіс гасцей, якія наведаюць інаўгурацыю, пакуль застаюцца невядомымі. У асяроддзі Зяленскага раней заяўлялі пра намер правесці такую інаўгурацыю, «якой яшчэ не было», паведаміла Бі-бі-сі.

### У Францыі выдзелілі сродкі пацярпелым ад «жоўтых камізэлек» бізнесменам

Прадпрымальнікі ў 34 гарадах Францыі, бізнес якіх пацярпеў ад акцый руху «жоўтых камізэлек», што працягваюцца амаль паўгода, атрымаюць ад улад краіны дапамогу агульнай сумай у 5,49 мільёна еўра. Аб гэтым паведамілі ў Мацін'ёнскім палацы — адміністрацыі прэм'ер-міністра Эдуара Філіпа. Там адзначаецца, што сярод гарадоў, бізнесмены якіх атрымаюць дапамогу, не толькі французская сталіца, але і Авіньён, Бардо, Кале, Дыжон, Ліён, Марсэль, Нант і іншыя. Як вядома, буйнамаштабныя пратэсты «жоўтых камізэлек» пачаліся ў Францыі 17 лістапада мінулага года з патрабаваннем не павышаць падатак на паліва і цэны на бензін. Незадаволеныя сацыяльнай палітыкай французскіх уладаў удзельнікі руху працягваюць выходзіць на вуліцы па ўсёй краіне, нягледзячы на абвешчаныя кіраўніцтвам Францыі меры для заспакаення сітуацыі.

### «Ферары» за два мільёны еўра сагналі падчас тэст-драйву



Гэта адбылося ў Дзюсельдорфе. Як паведаміла мясцовая паліцыя, падазраваны пад'ехаў да аўтасалона на таксі і заявіў, што хоча купіць выстаўлены там Ferrari 288 GTO 1985 года. Яму далі машыну на тэст-драйв. Калі праз дзве гадзіны тэставанне падвышло да завяршэння і прадавец выйшаў з машыны, патэнцыйны пакупнік націснуў на газ і з'ехаў. У апісанні аўтамабіля на сайце дылера гаворыцца, што калісьці ён належаў былому гоншчыку Формулы-1 Эдзі Ірвайну, які выступаў у камандзе Ferrari з 1996 па 1999 год. Падобныя аўтамабілі звычайна прадаюцца праз спецыялізаваныя таргі на аўкцыёнах Sotheby's і абыходзяцца новым уладальнікам у сярэднім прыкладна ў тры мільёны долараў. Не дзіўна, што прыкметная машына прыцягнула ўвагу шматлікіх мінакоў і кіроўцаў, і яе хутка знайшлі схаванай у гаражы гарадка Грэвенбройх, недалёка ад Дзюсельдорфа. Падазраваны, аднак, збег. Кіраўнік фірмы дылерскай кампаніі Бернхард Керкло заўважыў газеце Westdeutsche Allgemeine Zeitung, што перапрадаць гэты аўтамабіль было б немагчыма. Пакупнікі такіх рэдкіх калекцыйных аўто адразу б зразумелі, што «Ферары» сагнана, таму што ім добра вядомыя ўсе калі-небудзь прададзеныя машыны гэтай мадэлі. Дарэчы, усяго было выраблена толькі 272 аўтамабілі Ferrari 288 GTO.

Надвор'е

# ЗА ДАЖДЖАМІ ІДЗЕ ЦЯПЛО

**На выхадныя будзе да плюс 26 градусаў і пераважна без ападкаў**

**За першую палову месяца месцамі па краіне ўжо выпала месячная норма ападкаў. Але ў гэтыя выхадныя дні атмасферны фронт, які абумовіў няўстойлівае з дажджамі надвор'е, перамесціцца на крайні паўднёвы захад Беларусі. На астатняй тэрыторыі адаб'ецца ўплыў скандынаўскага антыцыклону і будзе па-сапраўднаму цёпла, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу яшчэ захаваецца няўстойлівае надвор'е, а франтальны раздзел прынясе пераважна па паўднёва-заходняй частцы краіны кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы і моцныя дажджы. Максімальная тэмпература складзе ад плюс 16 да 22 градусаў, месцамі па Гомельскай вобласці паветра прагрэецца да 25 цяпла. У выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны надвор'е стане вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах адаб'ецца ўплыў маларухомага франтальнага раздзелу, дзе не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў.



Ападкаў практычна не будзе ў суботу, толькі месцамі па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 градусаў па паўночным усходзе да 15 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Удзень прагназуецца 19—24 градусаў вышэй за нуль. У нядзелю па паўднёвым захадзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы чакаецца ад плюс 6 па паўночным усходзе да плюс 16 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. Удзень будзе сонечна і камфортна — 21—26 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На любы густ

# «ПЕШАХОДКА» ПОЙДЗЕ НА ПЛЯЦОЎКІ

**Якія святочныя і культурныя мерапрыемствы падрыхтаваны для жыхароў і гасцей сталіцы сёлета?**

— Музычна-турыстычны сезон будзе доўжыцца да канца верасня, — паведаміла **Ганна ШЫМАНСКАЯ, начальнік аддзела ўстаноў культуры ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама.** — У планах розныя цікавыя актыўнасці: інтэрактыўныя праграмы, джазавыя вечары, вячэрнія кінасеансы, святы нацыянальных культур, а таксама праекты «Пешаходка» і «Класіка ля Ратушы».

У Мінску плануецца задзейнічаць разнастайныя пляцоўкі: інфармацыйныя, адукацыйныя, забаўляльныя. У гэтым годзе пройдзе 16 свят нацыянальных культур, іх чарада пачнецца 25 мая паказам-дэманстрацыяй беларускай культуры. У гэты ж дзень пачнецца фестываль-кірмаш «Вясновы букет», на якім збяруцца больш за 400 майстроў з усёй Беларусі. 1 чэрвеня эстафету прыме Дзень Швецыі, на якім выступяць вядомыя беларускія і замежныя артысты. Напрыклад, разам з беларускім рок-гуртом J:МОРС выступіць спявачка са Швецыі Loreen.

Ужо ў гэтую суботу на тэрыторыі Верхняга горада стартуе вядомы музычны праект «Пешаходка», мэта якога — данесці да слухачоў якасную жывую музыку. Дарэчы, удзельнікі гэтага фэсту на працягу ўсяго лета будуць выступаць на 17 пляцоўках, пазначаных на «Музычнай карце» Мінска.

**Алена ПЛІС, дырэктар установы «Інфармацыйна-турысцкі цэнтр «Мінск»**, адзначыла, што на дадзены момант на тэрыторыі сталіцы турыстычную дзейнасць вядуць 136 арганізацый. Для экскурсійнага абслугоўвання атэставана 356 экскурсаводаў, 147 гідаў і перакладчыкаў:

— Турыстычная інфраструктура цалкам гатовая для правядзення шматлікіх мерапрыемстваў, у тым ліку да Еўрапейскіх гульняў. Распрацаваны шырокі выбар экскурсійных праграм па горадзе: больш за 60 групавых і 20 аўтарскіх экскурсій. У рамках нацыянальных культур пройдуць гастрафэсты, дзе ахвотныя змогуць пакаштаваць нацыянальныя стравы. Да таго ж для турыстаў распрацавана карта і будзе дзейнічаць канцэпцыя прасторавага арыентавання — 70 інфармацыйных стэндаў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# КЛОПАТ НЕ ЯНОТА, А ЭКАБОТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спытацца ў экабота, у які кантэйнер пакласці пэўнае смецце або як пазбегнуць назапашвання адходаў, можна не толькі на сайце, але і ў месенджары «Тэлеграм». Дастаткова ўвесці лагін @EcoideaBot і націснуць кнопку «Запусціць». Неўзабаве падобная магчымасць з'явіцца і на некалькіх іншых экалагічных сайтах, кажуць распрацоўшчыкі. Акрамя таго, віртуальны памочнік будзе «вучыцца», каб адказваць на большую колькасць пытанняў, што цікавяць людзей.

— Перапрацоўка сёння не вырашае праблему смецця глабальна, — кажа Яўген Лабанаў. — Трэба сыходзіць ад аднаразовага стылю жыцця, і наш робат падказвае не толькі разумныя спосабы пазбавіцца ад смецця, але і раіць экалагічна дружалюбныя альтэрнатывы аднаразовым таварам, ад якіх нельга пазбавіцца пасля выкарыстання інакш, як выкінуць на звалку.



### Зялёны кантэйнер: альбомы, паштоўкі, кардонкі

Беларусы часта сутыкаюцца з цяжкасцямі пры сарціроўцы смецця і вагаюцца, у які ж кантэйнер яго пакласці, бо на рынку існуе шмат тавараў, асабліва ўпакоўкі, зробленых з матэрыялаў, якія складана ідэнтыфікаваць.

«Звязда» разам са спецыялістам установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» паспрабавала разабрацца, што і чаму можна ці нельга выкідваць асобна.

У зялёны кантэйнер для макулатуры смела можна кідаць паперу з офісаў: лісты, канверты, каляровую паперу, календары, паштоўкі, паперу для нататак. Асобна раяць збіраць і старыя альбомы, блакноты, сшыткі, штодзённікі, газеты і часопісы. Перш чым адправіць у смецце, з усіх гэтых рэчаў трэба дастаць сашчэпкі, скобы, клейкія і пластыкавыя ўстаўкі, спружыны.

Асобна выкідваць можна таксама папяровую ўпакоўку: кардонкі ад цукерак, кардонныя кантэйнеры ад яек, папяровыя пакеты, упакоўкі з паперы ад цукру, мукі і іншага. Пры гэтым варта памятаць: ва ўпакоўцы не павінна быць рэштак ежы.

— Лішнія кампаненты ў другасных матэрыяльных рэсурсах (ДМР) не толькі ўскладняюць іх перапрацоўку, але і робяць гэты працэс больш дарагім, таму іх трэба выдаляць з макулатуры, перш чым пазбаўляцца ад яе, — тлумачыць **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»**.

У макулатуру нельга выкідаць: брудныя кардонкі з-пад піцы, фотаздымкі на паперы, аднаразовы папяровы посуд, паперу, якая пакрыта металічным ці пластыкавым слоем, сурвэткі, пергамент, хрусткія факсы і чэкі, папяровыя ручнікі, туалетную паперу і тэтрапакі з-пад малака, сокаў.

— Усе гэтыя рэчы нельга выкарыстоўваць на папяровых фабрыках як сыравіну для другасных вырабаў з-за невыдаляемых з іх забруджванняў, або таму, што яны ўтрымліваюць іншыя, непапяровыя слаі, якія цяжка аддзяліць, — кажа спецыяліст. — Таму ўсё пералічанае выкідайце ў звычайнае бытавое смецце.

### Жоўты кантэйнер: ПЭТ-бутэлькі, пакеты, бляшанкі

З пластыкавых ёмістасцяў трэба выдаліць рэшткі змесціва, мыць іх неабавязкова, раіць спецыяліст. Збіраць асобна варта пластыкавыя бутэлькі ад вады, напояў і малака, шампуняў, вадкага мыла, геляў для душу, з-пад бытавой хіміі і мыючых сродкаў. Бутэлькі з-пад алею, пластыкавыя коркі для бутэлек і ўпакоўкі ад яек з маркіроўкай «1» таксама прыдатныя для перапрацоўкі. Пакеты з-пад малака перапрацоўваюцца часткова, але і іх таксама лепш кідаць у пластыкавае смецце.

— Усё гэта падлягае перапрацоўцы. Накрыўкі ад ПЭТ-бутэлек, пра якія часта пытаюцца, ці выкідваць іх разам з бутэлькамі, сапраўды вырабляюцца з іншага віду пластыку, які тым не менш таксама перапрацоўваецца, таму асобна іх выкідваць не варта, — раіць Ніна Кульбеда.

Рознакаліберныя пакеты: фасовачныя, з ручкамі, пакеты-майкі — таксама пластыкавае смецце. Перш чым выкінуць яго, неабходна праверыць, каб там не засталося іншага смецця.

Шчыльная плёнка ад цяпліц, упаковачная плёнка, напрыклад, ад бытавой тэхнікі, таксама вартыя таго, каб не выкідваць іх у агульнае смецце.

— Гэта карысная другасная сыравіна, з якой у краіне вырабляюць розныя рэчы: ад бытавых да будаўнічых, — падкрэслівае Ніна Кульбеда. — Укладышы ў скрынкі для крохкіх вырабаў, якія звычайна робяцца з пенапласту, таксама смела выкідвайце ў кантэйнер для пластыку. Яны падлягаюць перапрацоўцы.

Цвёрдыя пластмасавыя вырабы накшталт тазоў, каністраў, вёдраў, — таксама ў пластык. У жоўты кантэйнер павінны трапляць і тэтрапакі з-пад сокаў і малака.

Як ні дзіўна, але кансервавыя і алюмініевыя бляшанкі таксама рэкамендуюць выкідваць у кантэйнер для пластыку або занесці ў пункт нарыхтоўкі.

— Для металічнай упакоўкі ў нас няма асобных кантэйнераў, бо гэтага віду смецця ўтвараецца не так шмат. Аднак адходы з кантэйнераў для ДМР усё роўна яшчэ раз сартуюцца, і бляшанкі з іх дастануць асобна. Перш чым выкінуць, выдаліце з іх рэшткі ежы, — рэкамендуе прадстаўніца Аператара.

У пластык нельга выкідаць: мяккія латкі для яек з успененага полістыролу, пракладкі, тампоны, памперсы, фальгу, СД-дыскі, абгорткі ад цукерак, магнітафонныя касеты, аднаразовы посуд усіх маркіровак.

Ёмістасці з-пад дэкаратыўнай касметыкі, упакоўкі ад чыпсаў, белыя баначкі ад смятаны і ёгуртаў, зубныя шчоткі і цюбікі ад пасты, — тара, якую таксама нельга збіраць у пластык.

Мяккая ўпакоўка ад маянэзу і кетчупу, а таксама моцна забруджаныя пакеты, асабліва з рэшткамі ежы, кантэйнеру для пластыку гэтак жа супрацьпаказаны.

— З гэтых рэчаў немагчыма атрымаць карысную другасную сыравіну з-за забруджвання або таму што ў іх скамбінаваны розныя матэрыялы, і іх шлях — у звычайнае смецце, — выносіць вердыкт спецыяліст.

### Сіні кантэйнер: бутэлькі ад напояў, бутэлечкі з-пад лекаў, слоікі

Напэўна, прасцей за ўсё разабрацца са шкляным смеццем. Бутэлькі ад напояў: піва, віна, шампанскага, гарэлкі ды іншых — гэта шклатара, якую неабходна выкідваць у спецыяльны кантэйнер. Сюды ж трэба класці шкляныя, у якіх раней былі лекі ці дзіцячае харчаванне. Слоікі, само сабой, — таксама шкло.

— Шклатара актыўна выкарыстоўваецца ў другаснай вытворчасці. З яе робяць новыя бутэлькі і слоікі. А шклабой выкарыстоўваюць, напрыклад, для вырабу керамічнай пліткі і дадаюць у фарбу для нанясення дарожнай разметкі, — дзеліцца Ніна Кульбеда.

У шклатару нельга выкідаць: крышталь, люстэркі, лямпачкі, кераміку, фарфор, шкляны посуд і шкло з мэблі.

— Хоць гэта таксама шкло, але яно мае іншы хімічны склад і не падыходзіць для вырабу новай шкляной тары, — абгрунтоўвае спецыяліст.

Штогод у Беларусі ўтвараецца каля чатырох мільёнаў тон цвёрдых бытавых адходаў, і ад нашай сумленнасці і адукаванасці залежыць, каб туды не трапляла карысная сыравіна, годная працягваць існаванне ў іншых рэчах.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## Добрая справа

# Дзейнічаць на папярэджанне, не забываючы пра мінулае

***Па якую дапамогу беларусы могуць звярнуцца ў Чырвоны Крыж?***

— Наша арганізацыя — найбуйнейшая ў Беларусі з гуманітарным кірункам. Мае амаль стагадовую гісторыю і аб'ядноўвае 440 супрацоўнікаў, звыш 16 тысяч валанцёраў і каля мільёна членаў па ўсёй краіне, — зазначыла **генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК) Вольга МЫЧКО.**

Летась каля 50 тысяч беларусаў, якія апынуліся ў надзвычайных і крызісных сітуацыях, атрымалі дапамогу ад арганізацыі. 11 валанцёрскіх атрадаў хуткага рэагавання (а гэта больш за дзве сотні чалавек па ўсёй краіне) гатовыя ў любы момант аказаць гуманітарную і псіхасацыяльную дапамогу насельніцтву. Акрамя таго, арганізацыя клапоціцца і аб перасяленцах з Данецкай і Луганскай абласцей, якія жывуць у Беларусі і знаходзяцца ў асабліва ўразлівым стане.

— Паколькі арганізацыя ўваходзіць у Дзяржаўную сістэму па папярэджванні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, то адзін з ключавых кірункаў дзейнасці — навучанне грамадзян навыкам першай дапамогі. Гэтыя веды павінны засвойвацца яшчэ падчас заняткаў у школе, аднак калі ў рэальным жыцці здараецца бяда, то толькі адзінкі здольныя засцерагчы сябе і дапамагчы іншым, — паведаміў **спецыяліст БТЧК па першай дапамозе Васіль СКУБІЛАЎ.**

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа запрашае ўсіх ахвотных бясплатна прайсці 16-гадзінны курс па аказанні першай дапамогі. Як выратаваць чалавека, калі вы знаходзіцеся на пляжы ў адных плаўках, а пад рукой няма аптэчкі? Як правільна вызначыць стан, у якім знаходзіцца пацярпелы, па першых сімптомах? Ды і што рабіць, каб не нашкодзіць ні сабе, ні людзям у надзвычайнай сітуацыі? Усяму гэтаму можна навучыцца ў прафесіяналаў Чырвонага Крыжа, а пры паспяховым праходжанні курса — атрымаць сертыфікат міжнароднага ўзору. Часта праводзяцца і асобныя майстар-класы і трэнінгі з рознымі ўхіламі па аказанні першай дапамогі. Напрыклад, для маладых мам ці пажылых людзей. Дарэчы, валанцёры ІІ Еўрапейскіх гульняў таксама праходзяць навучанне ў Чырвоным Крыжы.

— Аднаўленне сямейных сувязяў — яшчэ адзін кірунак, які актыўна развіваецца ў нашай арганізацыі. Валанцёры і супрацоўнікі дапамагаюць беларусам знайсці сваякоў па ўсім свеце, кантакт з якімі згубіўся ў выніку ўзброеных канфліктаў, міграцыі ці стыхійных бедстваў, — расказаў **спецыяліст БТЧК па пошуку Ідаэль ГЕРЭРА**. — Беларусы часцей за ўсё звяртаюцца з запытамі па сваяках, якія зніклі без вестак падчас Другой сусветнай вайны. Мы дапамагаем і ў пытаннях высвятлення дакладных месцаў пахавання загінулых байцоў. Пошукавыя магчымасці ў Чырвонага Крыжа даволі вялікія: беларускае таварыства цесна супрацоўнічае з архівамі, ваеннымі камісарыятамі, калегамі з нацыянальных таварыстваў іншых краін, а таксама з Міжнароднай службай пошуку ў Германіі. Калі вашы сваякі загінулі за межамі Беларусі, то спецыяльная даведка, выдадзеная Чырвоным Крыжам, дае права наведаць іх пахаванні двойчы ў год па бясплатнай візе.

**Ганна КУРАК.**

## Будзь у курсе!

# У ЛЯСЫ МОЖНА ВА ЎСІХ РЭГІЁНАХ

**У Беларусі поўнасцю знята забарона на наведванне лясных угоддзяў. Пасля працяглых ападкаў сітуацыя ў лясным фондзе стабілізавалася, паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса.**

Там нагадалі, што рашэнні па ўвядзенні і зняцці забароны на наведванне лясоў прымаюцца мясцовымі органамі ўлады па хадайніцтве лесагаспадарчых устаноў або раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях. Меры абмежавальнага характару ўводзяцца ў выпадку ўстанаўлення высокага класа пажарнай небяспекі.

З пачатку года ў Беларусі зафіксавана каля 330 лясных пажараў на агульнай плошчы 2,4 тысячы гектараў. Найбольшая іх колькасць адбылася ў лягасах Брэсцкай вобласці (130 выпадкаў на 866 гектарах без уліку плошчы пажару ў Палескім лягасе) і Гродзенскай вобласці (37 выпадкаў на 820 гектарах).

Мінулы красавік у Беларусі быў самым сухім за апошнія 75 гадоў. За гэты месяц у сярэднім па краіне выпала сем міліметраў ападкаў, што складае 18,2 % кліматычнай нормы. Сярэдняя тэмпература паветра па краіне ў красавіку склала плюс 8,8 градуса, што на 1,5 градуса вышэй за кліматычную норму. Высокая пажарная небяспека была абумоўлена засушлівым і ветраным надвор'ем. Акрамя таго, некалькі лясных пажараў прыйшло з Украіны, у тым ліку той, што бушаваў на Альманскіх балотах. У пачатку мая ў Беларусі ўстанавілася дажджлівае надвор'е, у сувязі з чым становішча ў лясах стала больш спрыяльным.

Міністэрства лясной гаспадаркі ініцыявала поўнае зняцце забарон на наведванне лясоў. Мясцовыя органы ўлады прымалі такія рашэнні па меры стабілізацыі пажаранебяспечнай абстаноўкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




## ЗА АБЛОМАМ — АБЛОМ

Мой сваяк Юра гадоў з дзесяць адпрацаваў машыністам газакампрэсарнай станцыі недзе ў Запалляр'і. Сам казаў, што страціў там шмат здароўя, але ж зарабіў досыць вялікія грошы і вярнуўся дамоў на гістарычную радзіму. Тут, па-першае, ён збіраўся прыняць бабуліну спадчыну, а заадно — адпачывеньцыца, гэта значыць, ажаніцца з добрай, такой жа ціхмянай, пажаданна вясковай дзяўчынай...

Высветлілася, аднак, што такіх у ваколіцах бабулінай вёскі яшчэ менш, чым на Ямале, таму Юра, прадаўшы спадчынную сялібу, падаўся ў Мінск, па пратэкцыі дзядзькі ўладкаваўся на мясакамбінат.

Гэту падзею яны з тым самым дзядзькам вырашылі адзначыць у рэстаране. Там жа, за суседнім столікам, сядзелі дзве сяброўкі — святкавалі паспяховую здачу сесіі. Пазнаёміліся, і з адной — прыгажэйшай — Юра стаў сустракацца.

Трэба сказаць, што ён, ад прыроды вельмі спакойны, рабіў гэта, як разумеў: на спатканні прыходзіў з кветкамі, падарункамі ды білетамі на канцэрты, вадзіў сваю Алу па кафэ-рэстаранах. Я казаў: «Ты глядзі, брат, не памыліся, бо можа стацца, што гэта прыгажуня западзе на грошы, а сам ты ёй...»

Юра пра гэта нават слухаць не хацеў: месяцы праз два ці тры ён ужо апынуўся ў загсе, потым — у доўгім вясельным падарожжы па поўдні Францыі. (Хваліўся, дарэчы, што жылі там у шыкоўным атэлі, што ад душы паплёскаліся ў цёплым моры, што абое прыадзеліся, хоць грошай спусцілі і шмат.)

А далей — болей, бо купілі трохпакаёвую кватэру, абсталілі.

Зараз, здавалася б, толькі і жыць (тым больш што жонка ашчаслівіла Юру дачушкай), калі б у адведкі да іх не прыехала ўжо знаёмая сяброўка на новенькім «мерседэсе». «Я таксама хачу... Што — я горшая?» — спытала жонка ў Юры. «Ты ў сто разоў лепшая! — заверыў ён, — але ж ні правоў, ні грошай на новую машыну ў нас няма, бензін даражэе ледзь не кожны тыдзень, да таго ж нам ездзіць няма куды...» — «Так-так, — падхапіла Ала, — нам трэба яшчэ і дачу...»

Карацей, слова за слова і ледзь не штодня сварка. Жонка дагаварылася да таго, што Юру няма чаго сядзець дома, што ён проста павінен ехаць (а хоць бы і на Ямал!) ды зарабляць грошы... А калі ён адмовіўся, прыгразіла, што падасць на развод, і яны без яго пражывуць (мама да іх пераедзе), а вось ён...

У выніку цешча, якая і без таго, можна сказаць, днявала і начавала ў кватэры зяця, перавезла туды свае рэчы. Юра са сваімі апынуўся адзін у цешчынай старэнькай «хрушчоўцы», якую да ўсяго яшчэ і затапілі зверху: столь на кухні парыжэла і аблупілася, на сцяне «задыхаў» ладны кавалак пліткі... З ЖЭСа павінен быў прыйсці спецыяліст, каб замераць аб'ём рамонту.

У прызначаны дзень парог кватэры і сапраўды пераступіла... сапраўдная прыгажуня. З сумачкі яна дастала 5-метровую рулетку і руку, сабралася на нешта паступіцца, каб залезці ўверх — памераць плошчу столі.

Юра прапанаваў узяць гэту лічбу з тэхпашпарта — спецыялістка не згадзілася.

Тады ён сказаў, што прасцей памераць падлогу — яны ж са столлю роўныя.

Гэтую прапанову дзяўчына прыняла і, пакуль яны разам адсоўвалі мэблю ды мералі плошчу, расказала, што завуць яе Ірынай, што бацька яе з'ехаў у свой Дагестан, а мама жыве ў вёсцы...

«Прыгожая, вясковая, не распешчаная...» — Юра ва ўсе вочы глядзеў на гэтае чароўнае дзіця і нават падумаў, што нехта ж яго прыручыць, нехта з ім зажыве... «Дык чаму б не я?.. Калі ідзе да разводу...» — мільганула думка.

Госця тым часам усё запісала і сышла. Але... Не паспеў гаспадар паставіць на месца стол ды ўсе табурэткі, як яна... вярнулася і сказала, што трэба пачаць спачатку: маўляў, раз начальства сказала замераць столь, значыць, трэба замераць столь.

Юра ўздыхнуў, выцягнуў з кладоўкі драбінкі і заадно пацікавіўся, ці праходзілі ў Ірынай школе геаметрыю.

Прыгажуня надзьмулася, а калі аказалася, што столь каля вакна на два сантыметры шырэйшая за падлогу, пераможна глянула на гаспадара і сышла не развітаўшыся.

...Вось такія мітрэнгі зваліліся ў апошні час на майго хутчэй бедняга, чым багатага сваяка.

**Л. Новік,**

*г. Мінск.*

## ДЗЕ СКОКАМ, ТАМ... БОКАМ

У такім далёкім 1952-м мы, Лёня, Гарык і два Валодзі, першакурснікі політэхнічнага інстытута, засяліліся ў адзін пакой інтэрната. Пражылі там пяць гадоў, а пасябравалі — на ўсё жыццё. Прычым спрыяла гэтаму не толькі вучоба, але і агульныя захапленні. У прыватнасці, для таго каб час ад часу разгружаць свае мазгі ды трымаць сябе ў добрай фізічнай форме, мы, усе ўчатырох, запісаліся ў лыжную секцыю. Нейкі час пахадзілі (тады, дарэчы, гэта бясплатна было), а потым Гарыку, мусіць, збрыдзела: не захацеў ён лыжамі шоргаць па снезе — запісаўся ў аэраклуб.

Трэба сказаць, што туды не кожнага і бралі... Таму вучыўся ён вельмі старанна. І нават з парашутам аднойчы скочыў, але ж не самастойна — з інструктарам, а гэта зусім не тое.

Дзень, калі Гарык збіраўся скакаць сам, помню як зараз, бо з інтэрната ён сыходзіў, можна сказаць, жаніхом — шчаслівым, узрушаным... А вось вярнуўся, не павелрыце, іншым чалавекам — сумным, пастарэлым...

Мы, вядома ж, давай распытваць, і Гарык хоць-нехаць расказаў, што падрыхтаваны быў добра: лепш за ўсіх засвоіў тэорыю. І вось сам скачок... За спінай — два парашуты: асноўны і запасны. Першы, як расказваў, праз чатыры секунды павінен быў аўтаматычна раскрыцца. А таму ён ляцеў і лічыў: раз, два, тры, чатыры — парашут... не раскрываецца. Што рабіць? Ён рве на сябе кольца запаснога: з ім, дзякуй богу, усё ў парадку — гэты раскрываецца.

Але ж Гарык не паспеў з палёгкай уздыхнуць, бо тут жа ў яго над галавой прагучала досыць гучнае «ш-ш-шух» — раскрыўся парашут асноўны... А яму б хоць з адным неяк справіцца — дзе там з двума...

Карацей, паматляла яго ў паветры, як тую пушынку і пры гэтым усё болей «адносіла» на лес. «Ну, думаю, зараз як лясне аб якую сасну, мне і капец», — прызнаваўся хлопец.

Але ж потым неяк знізіўся, стаў чапляцца за кусты... Небараку яшчэ і па іх пацягала б, калі б не інструктар, які разам з хлопцамі пад'ехаў на выручку. Разам уратавалі...

Пасля гэтага ў аэраклуб Гарык, вядома ж, не пайшоў, сказаў: «Пажыць хачу».

...Зноў усе ўчатырох мы сталі займацца лыжамі, аж да той пары, пакуль Гарыка зноў не звабіў палёт: на гэты раз — скачкі з трампліна. Недзе з месяц на трэніроўкі хадзілі ўдвух з сябруком, але аднойчы вярнуліся нібыта з фронту: у аднаго рука на падвязцы, у другога... Пытаемся:

— Што — зноў прыгоды?

— Ну, Валодзя, бач, руку падвярнуў, — уздыхнуў Гарык.

— А ты, можна падумаць, лепшы? На пятую кропку як гопнуўся, ажно порткі парваў, — расказваў Валодзя. — У чым цяпер на заняткі пойдзеш?

...Карацей, не атрымалася з гэтых хлопцаў ні парашутыстаў, ні слаламістаў... А вось у спаборніцтвах на лыжнях мы з Лёнем перамагалі. І нават па спартыўным разрадзе маем.

**У. Сяргейчык,**

*г. Магілёў.*

## НАБЫТЫ ІМУНІТЭТ

Глядзіш тэлевізар, слухаеш радыё, чытаеш газеты і дзіву даешся, які ж далікатны цяпер народ! Там даросламу дзядзьку «хуткую» выклікалі пасля ўкусу пчалы, туды ратавальнікі ездзілі, каб асінае гняздо пабурыць...

А ў маім далёкім дзяцінстве быў сусед па вулічнай мянушцы Кароль. У яго вадзіліся пчолы. І калі нейкая з іх кусала дзіця, то бацькі яго (альбо дзядулі-бабулі) бралі малое на рукі і неслі да суседа — «прад'яўляlі» Каралю распухлую частку цела, і той, прысаромлены ды вінаваты, намазваў мёдам лусту хлеба — працягваў дзіцяці. Пухліна ад той смакаты «спадала» тут жа, боль праходзіў, а замест яго з'яўляўся гонар: я, маўляў, мёд сёння еў!

І ніякіх там «хуткіх».

Тое ж было і з восамі. Гадоў колькі таму мой гаспадар (светлай памяці!) у двары пад ігрушай прыгожую лаўку змайстраваў. Мы любілі там адпачыць...

Нашы восы, трэба сказаць, таксама: яны елі свае грушы, мы — свае. Месца пад сонцам хапала ўсім, і ніхто нікому не замінаў.

...А летась у нас вырас добры ўраджай вінаграду. Падумала, не прападаць жа дабру: паставіла яго на віно.

Працэс браджэння скончыўся глыбокай восенню — сабралася разліваць па бутэльках. Але ж спачатку адліла сабе ў кубак для дэгустацыі, паставіла яго на стол. Толькі прыступіла да разліву, аднекуль тут як тут прыляцела аса, закружыла над галавой: трэба разумець, стала прасіць, каб я пачаставала? Але ж мне ў той момант было не да яе — адмахнулася. Аса, трохі пакружыўшы, сціхла. «Пакрыўдзілася, мусіць... Недзе паляцела», — падумала я. А скончыўшы «разліў», падышла да стала і ўбачыла, што аса мяне апярэдзіла: яна ўжо правяла дэгустацыю і нават напілася, бо цяпер, шчаслівая, плавала ў кубку.

Выходзіць, з усімі можна дамовіцца, але, можа, не ўсім?

**Тамара Маркушэўская,**

*аг. Жамчужны, Баранавіцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Адкуль у свінні рогі растуць

### Калі імпэт — толькі дзеля імпэту, што яму супрацьпаставіць?

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1601.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 16 мая 2019 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

17 мая 2019 г. № 20 (505)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Лекі, лён і... кіно



Якія перспектыўныя напрамкі беларуска-індыйскага супрацоўніцтва гатовы развіваць бакі? стар. 2

### Транзітны патэнцыял...



...і мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы стануць адной з тэм VI Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі. стар. 2

### Плён ад добрасуседства



Беларуска-польскі эканамічны форум «Добрасуседства-2019» пройдзе ў чэрвені. стар. 3

### Дом сацыяльных паслуг



Вясковая грамада ўзяла ў часовае карыстанне прыватную хату. стар. 14

### Гальшаны запрашаюць!



Юбілейны рэгіянальны фестываль «Гальшанскі замак» чакае гасцей ужо заўтра, 18 мая. стар. 16


# ПАКІНУЦЬ НЕЛЬГА ЗАКРЫЦЬ

## Сельскае насельніцтва не застанецца без медыцынскай дапамогі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**За апошнія пяць гадоў колькасць медыцынскіх устаноў, якія абслугоўваюць сельскае насельніцтва, скарацілася, і гэта тэндэнцыя працягваецца. Нярэдка кропку ў існаванні тых жа ФАПаў (фельчарска-акушэрскіх пунктаў) ставіць аварыйны стан будынкаў. Але найчасцей прычына зусім іншая — дэмаграфічная. Жыхароў становіцца менш, і трымаць ФАП у апусцелай вёсцы немэтазгодна. Але ж людзі, асабліва пажылыя, якія там засталіся, усё роўна маюць патрэбу ў наіранні доктара ці фельчара. Бясспрэчна, што часта даехаць да паліклінікі ў райцэнтры — тая яшчэ задача і для сталага чалавека, і для таго, хто днём заняты на рабоце. Як сёння вырашаецца балючае пытанне аказання медыцынскай дапамогі на вёсцы, разбіралася карэспандэнт «МС».**

У нашай краіне сельскіх жыхароў прымаюць 2 048 ФАПаў, 90 бальніц сястрынскага догляду, 133 участковыя бальніцы, 610 амбулаторый урача агульнай практыкі і 19 урачэбных амбулаторый. Такія звесткі прыводзіць Міністэрства аховы здароўя на пачатак гэтага года. Яны абслугоўваюць больш за 2 мільёны 45 тысяч вяскоўцаў. Дапамогу ў гэтых установах аказваюць, як правіла, урач і сярэдні медыцынскі персанал, у ФАПах — толькі фельчар. У сельскіх медустановах сёння працуе 1 225 дактароў і 8 493 фельчары, медсястры ці памочнікі ўрача.

**ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4-й стар.**

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

# МАСТАК ДЛЯ КЛІМАВІЧ,

## або Як вядомы беларускі пейзажыст упрыгожвае сваімі скульптурамі малую радзіму

**Вы чулі? Хутка ў Клімавічах прапішацца сама княгіня Мяшчэрская. Калі гуляеш па раённым цэнтры, міжволі звяртаеш увагу на незвычайны будынак з мезанінам і тонкай ажурнай разьбой. Гэта асабняк XIX стагоддзя, дзе жыла княгіня Марыя Мяшчэрская. Зараз тут музей, у ім ёсць нават чайны пакойчык княгіні. А хутка каля дома з'явіцца і скульптура былой гаспадыні. Над гэтай кампазіцыяй зараз актыўна працуе мастак Леанід ЯЧНЕЎ, ураджэнец гэтага раёна, асоба, вядомая ў мастацкіх колах і сярод аматараў жывапісу. Ён удзельнік міжнародных пленэраў і выставак. Яго карціны ўпрыгожваюць музейныя і прыватныя калекцыі ў Беларусі і за яе межамі. Але перш за ўсё ён імкнецца стварыць імідж сваёй малой радзіме.**

### След у гісторыі

— Адкрыццё скульптуры плануецца 18 мая, — паведамляе мастак. — Княгіня будзе сядзець на лаўцы, а побач з ёй застанецца вольнае месца для фотасесій. Вобраз гаспадыні крыху міфічны. Яе фота, на жаль, не захавалася, але ў мяне добрая фантазія. Ды і не мог я адмовіць, калі да мяне звярнулася вельмі захопленая сваёй справай кіраўніца раённага краязнаўчага музея Дар'я Эверс.

стар. 15



Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Давер — аснова адносін

*Беларусь гатова дзяліцца з Латвіяй досведам па дасягненні Мэт устойлівага развіцця*

Па выніках мінулага года Латвія заняла 14-е месца па тавараабароце і 10-е месца па экспарце сярод краін, з якімі Беларусь ажыццяўляе знешнегандлёвыя аперацыі. У адносінах паміж дзяржавамі вядучую ролю адыгрывае давер, упэўнена **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА.** Дзякуючы наладжанаму міжпарламенцкаму дыялогу Беларусь і Латвія вырашаюць пытанні ў тым ліку на ўзроўні профільных камісій, міністэрстваў, рэгіёнаў, адзначыла віцэ-спікер падчас сустрэчы з дэпутатамі Сейма Латвіі.

У 2017 годзе парламентарыі абмяркоўвалі пытанні супрацоўніцтва падчас сумеснага чэмпіянату свету па хакеі ў 2021 годзе. Узаемадзеянне ў турызме, у тым ліку медыцынскім, лагістыцы, навуцы, адукацыі, харчовай прамысловасці, дрэваапрацоўцы і сельскай гаспадарцы ўвайшло ў план мерапрыемстваў урадаў дзвюх краін на сярэднетэрміновую перспектыву.

Беларусь у асноўным экспартуе суседцы прадукцыю лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці, нафтапрадукты, нафтахімію, металавырабы, угнаенні, будаўнічыя матэрыялы, спіртныя напоі. Летась экспарт дасягнуў 485,6 мільёна долараў ЗША, што склала 138,8 % да ўзроўню 2017 года. У Беларусі працуе 585 прадпрыемстваў з удзелам латвійскага капіталу. Інвестары з Еўрапейскага саюза, зацікаўленыя ў рэалізацыі праектаў у сферы гандлю, паслуг, дрэваапрацоўкі, фармацэўтыкі.

Не менш важнай за эканамічныя і палітычныя адносіны Мар'яна Шчоткіна лічыць экалогію: трансгранічныя водныя рэсурсы і іх захаванне, укараненне зялёнай эканомікі на тэрыторыі Латвіі.



Фота БелТА.

Вячаслаў ДАМБРОЎСКІС і Мар'яна ШЧОТКІНА.

Як адзначыў **старшыня камісіі Сейма па доўгатэрміновым развіцці Вячаслаў ДАМБРОЎСКІС,** Латвіі ёсць чаму павучыцца ў Беларусі. У прыватнасці, дэпутаты наведалі Парк высокіх тэхналогій і Кітайска-беларускі індустрыяльны парк. Засталіся ўражаныя хуткасцю будаўніцтва, бо некалькі гадоў таму на месцы «Вялікага каменя» былі толькі лугі і лясы.

Вячаслаў Дамброўскіс паведаміў, што Латвія зацікаўлена ў досведзе Беларусі ў развіцці адносін з Кітаем, а таксама галіны інфармацыйных тэхналогій.

«Мы бачым магчымасці для супрацоўніцтва. Улічваючы, што ў Беларусі няма выхаду да мора, можам прапанаваць вельмі выгадныя ўмовы карыстання портамі. Акрамя таго, Латвія можа даць сабраным на яе тэрыторыі таварам статус «Зроблена ў Еўрапейскім саюзе», — падкрэсліў Вячаслаў Дамброўскіс.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## Транзітны патэнцыял...

*...і мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы — стануць адной з тэм VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі*

У Савеце Рэспублікі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова адбылася нарада па падрыхтоўцы пытання «Аб развіцці транзітнага патэнцыялу і мадэрнізацыі транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы» да разгляду на пасяджэнні Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Плануецца, што пасяджэнне пройдзе ў ліпені ў Санкт-Пецярбургу ў рамках VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Падчас нарады абмяркоўваліся перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы, а таксама дасягнута дамоўленасць прапрацаваць магчымасць правядзення ў чэрвені на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, што ў Гомелі, беларуска-расійскай навукова-практычнай канферэнцыі па пытаннях развіцця транзітнага патэнцыялу і мадэрнізацыі транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы.

# ЛЕКІ, ЛЁН І... КІНО

### Якія перспектывы далейшага развіцця беларуска-індыйскага супрацоўніцтва?

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй Міхаіл Мясніковіч правёў сустрэчу з ганаровым консулам Рэспублікі Беларусь у Мумбаі Лалітам Чакані.**

Разгледжаны ход рэалізацыі сумеснага праекта з найбуйнейшай індыйскай кампаніяй Сіпла па стварэнні ў беларускай сталіцы навукова-тэхналагічнага цэнтра па выпуску лекавых прэпаратаў, паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі.

Цэнтр з'явіцца на базе дзяржаўнага прадпрыемства «Акадэмфарм» НАН Беларусі. Плануецца, што тут будуць выпускаць сродкі для лячэння ВІЧ-інфекцыі, гепатыту В і гепатыту С, а таксама хваробы Альцгеймера і артэрыяльнай лёгачнай гіпертэнзіі. Сіпла ўжо інвеставала ў праект мільён долараў.

Агульны аб'ём інвестыцый ацэньваецца ў 10 мільёнаў долараў. Беларусь зацікаўлена ў паспяховай рэалізацыі праекта, падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.



sovrep.gov.by

Падчас перагавораў размова таксама ішла аб запланаваным візіце ў Мінск летам бягучага года дэлегацыі кампаніі Сіпла на чале са старшынёй праўлення Юсуфам Хамідам.

Акрамя таго, Лаліт Чакані праінфармаваў Міхаіла Мясніковіча аб новых праектах, якія плануецца рэалізаваць у Беларусі з удзелам індыйскага бізнесу. У прыватнасці, прапрацоўваецца магчымасць узаемадзеяння адной з індыйскіх кампаній з Аршанскім ільнокамбінатам. «Беларускі лён цікавіць нашых інвестараў, тут у нас праглядаюцца добрыя перспектывы», — адзначыў ганаровы консул.

Яшчэ адна перспектыўная галіна для развіцця партнёрства — кініндустрыя. У хуткім часе на базе «Беларусьфільма» плануецца пачаць здымкі першага індыйскага фільма. «Разлічваем, што гэты праект стане свайго роду лакаматывам для далейшага партнёрства дзвюх краін у кініндустрыі», — адзначыў Лаліт Чакані.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ДВУХБАКОВЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў сумесна са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерыем Варанецкім правёў сустрэчу з намеснікам міністра замежных спраў Чэхіі Алешам Хмеларжам.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, на сустрэчы былі абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама перспектывы развіцця адносін паміж ЕС і Беларуссю.

Чэхія з'яўляецца актыўным удзельнікам Еўрасаюза і выступае за паглыбленне супрацоўніцтва з краінамі Усходняй Еўропы, у тым ліку з Беларуссю, падкрэсліў намеснік міністра. «У другой палове 2022 года Чэхія прыме старшынства ў ЕС, і мы зацікаўлены ў тым, каб паглыбляць узаемаадносіны з краінамі «Усходняга партнёрства», — заявіў ён. Алеш Хмеларж адзначыў важнае значэнне пагаднення аб прыярытэтах партнёрства паміж ЕС і Беларуссю, якое рыхтуецца да падпісання, і выказаў надзею на яго хуткае заключэнне. «Разлічваем, што пасля ліквідацыі шэрагу заўваг гэты дакумент будзе падпісаны», — заявіў ён.

Алеш Хмеларж таксама нагадаў, што Чэхія ўдзельнічала ў рабоце па падрыхтоўцы пагаднення аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж ЕС і Беларуссю. «Гэтая праца знаходзіцца на заключным этапе, і мы гэтаму рады», — кажа ён.

У цэлым Чэхія зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю па многіх напрамках. «Я тут дзеля таго, каб інтэнсіфікаваць адносіны паміж нашымі краінамі», — падкрэсліў намеснік міністра.



sovrep.gov.by

Паводле яго слоў, добрая аснова для гэтага сфарміравана. Дыялог паміж знешнепалітычнымі ведамствамі носіць рэгулярны характар, развіваюцца міжпарламенцкія кантакты, расце тавараабарот. У 2018 годзе аб'ём узаемнага гандлю вырас на 35,5 % у параўнанні з 2017 годам да 393 мільёнаў долараў. «Гэта добрая лічбы, якія кажуць аб існуючым патэнцыяле ўмацавання нашага двухбаковага партнёрства, перш за ўсё рэгіянальных сувязяў. Цэлы шэраг рэгіёнаў Чэхіі зацікаўлены ва ўсталяванні адносін з беларускімі рэгіёнамі. Я перакананы, што сферу рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі можна паглыбляць», — упэўнены Алеш Хмеларж.

У сваю чаргу, Сяргей Рахманаў адзначыў, што Беларусь задаволена ўзроўнем развіцця двухбаковых сувязяў з Чэхіяй і разлічвае на іх далейшае ўмацаванне. У якасці прыярытэтных напрамкаў супрацоўніцтва ён назваў прамысловую вытворчасць, пастаўкі прадуктаў харчавання, сферу высокіх тэхналогій, навуку і адукацыю.

Валерый Варанецкі падзякаваў Чэхіі за падтрымку на міжнародных пляцоўках беларускіх рэзалюцый, у тым ліку па прасоўванні лічбавай эканомікі ў інтарэсах забеспячэння эканамічнага росту на прасторы АБСЕ. Ён таксама выказаў словы падзякі за работу па падрыхтоўцы дакументаў аб партнёрстве з Еўрасаюзам. «Ваш візіт кажа пра зацікаўленасць у супрацоўніцтве з нашай краінай. Гэта нас радуе. Мы таксама зацікаўлены ў паглыбленні партнёрства з Чэхіяй», — падсумаваў старшыня камісіі.

ФОРУМ

# СУСЕДСКІЯ СТАСУНКІ

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі да форуму «Добрасуседства»

## Рабочая сустрэча прайшла пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента Міхаіла Мясніковіча

**Секцыі форуму ахопяць найбольш актуальныя напрамкі двухбаковага партнёрства: міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, лагістычныя паслугі, інфармацыйныя тэхналогіі, паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі.**

Традыцыйна дзелавыя колы дзвюх краін правядуць кантактна-кааперацыйную біржу. Акрамя таго, на базе Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта беларускія і польскія спецыялісты абмяркуюць перспектывы ўзаемадзеяння ў сферы навукі і адукацыі. Асобна ў Гродне абмяркуюць беларуска-польскія трансгранічныя праекты.

XXII беларуска-польскі эканамічны форум «Добрасуседства-2019» пройдзе 6—7 чэрвеня ў Мінску. Яго арганізатарам выступае Беларуская гандлёва-прамысловая палата.

У адкрыцці форуму прымуць удзел старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч і маршалак Сената Польшчы Станіслаў Карчэўскі. Плануецца, што 6 чэрвеня яны таксама стануць удзельнікамі цырымоніі адкрыцця ў Гродне мемарыяльнай дошкі Чэслава Немена. Па папярэдніх падліках, усяго ў форуме прымуць удзел каля 400 чалавек.

АРГКАМІТЭТ

# Моладзі дадуць слова

## І праекты яе падтрымаюць на ўзроўні Саюзнай дзяржавы

**VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе 17—18 ліпеня ў Санкт-Пецярбургу, будзе папярэднічаць вялікі Маладзёжны форум. Ён адбудзецца 15—16 ліпеня, пасля чаго яго ўдзельнікі працягнуць працу на секцыях «дарослага» форуму, дзе разам з вядомымі палітыкамі і эканамістамі, прадстаўнікамі бізнесу абмяркуюць надзённыя праблемы беларуска-расійскага партнёрства.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Тэма сёлетняга форуму: «Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва як аснова фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы». Пра гэта журналістам паведаміла **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і старшыня арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі Мар'яна ШЧОТКІНА.**

«Перш за ўсё плануецца правядзенне вялікага Маладзёжнага форуму, пасяджэнне Савета Маладзёжнага парламента пры Парламенцкім сходзе Беларусі і Расіі. У працяг — пасяджэнне шасці секцый, дзе моладзь будзе абмяркоўваць важныя пытанні разам з вядомымі людзьмі, прадстаўнікамі бізнесу. На гэтых секцыях будуць разгледжаны асноўныя напрамкі развіцця супрацоўніцтва дзвюх краін: інфармацыйная прастора, сумесныя маладзёжныя праекты, культурна-гуманітарная дзейнасць, турызм, партнёрства рэгіёнаў», — расказала старшыня аргкамітэта.

Мар'яна Шчоткіна акцэнтавала, што маладым людзям у сёлетнім форуме адводзіцца асаблівая роля. «Ім сёння важна ўдзельнічаць у гэтай рабоце, у іх таксама ёсць ініцыятывы, і калі выпрацаваны прапановы пра тое, якія праекты патрэбныя, абавязкова падтрымаем!», — паабяцала яна.

«Палітыка, эканоміка — гэта добра, але ніколі яшчэ воля народа не заставалася ўбаку, — пракаментавала тэму форуму віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Калі мы фарміруем нашу Саюзную дзяржаву, пражывем у яе рамках, мы не можам не ўлічваць тое, што нашы народы жадаюць працаваць разам. Так, мы захоўваем сваю суверэннасць, мы ўсе — незалежныя дзяржавы, мы абавязкова шануем сваё, нацыянальнае, але пры гэтым не павінны разбураць дружбу з тымі дзяржавамі, з якімі гістарычна завязаліся добрыя адносіны. Таму ўмацаванне гэтага складніка ўваходзіць у задачы Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі».

Акрамя таго, плануецца прааналізаваць выкананне і эфектыўнасць раней заключаных на падобных пляцоўках пагадненняў. «Эканамічны складнік па-ранейшаму будзе важны, — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. — Гандлёва-эканамічныя адносіны будуць абмяркоўвацца як праз прызму рэгіянальнага супрацоўніцтва, так і на Дзелавым савеце. Бізнес-супольнасць дзвюх краін сустрэнецца за круглым сталом, каб абмеркаваць праблемы і знайсці спосабы іх вырашэння, выйсці з канкрэтнымі прапановамі да ўрадаў і парламентаў».

Як заўсёды, на палях форуму будуць заключацца новыя пагадненні, гэтым разам — не толькі паміж рэгіёнамі, але і паміж установамі культуры, прапрацоўваецца магчымасць з'яўлення сумеснага дакумента паміж кінастудыямі Беларусі і Расіі, паведаміла старшыня аргкамітэта.

«На пленарным пасяджэнні 18 ліпеня, мы вельмі спадзяёмся, што яно будзе праходзіць з удзелам прэзідэнтаў, будуць абмеркаваны ўжо вынікі гэтых мерапрыемстваў, прыняты адпаведны дакумент», — падсумавала парадак дня форуму Мар'яна Шчоткіна.

Учора ў Савеце Рэспублікі адбылося чарговае пасяджэнне аргкамітэта па ўдзеле беларускага боку ў Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі. У сярэдзіне чэрвеня плануецца правесці сумесны аргкамітэт з расійскім бокам, на ім будуць зацверджаны прозвішчы выступоўцаў і тэмы дакладаў.

Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што рэгіянальныя форумы — вельмі значная пляцоўка для дыялогу, на якой шчыра абмяркоўваюцца праблемныя пытанні. Нездарма ў рамках беларуска-расійскага форуму праходзіць пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі, сёлета яно пройдзе 17 ліпеня. Вядзецца вялікая падрыхтоўчая работа, якая ўключае правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі, круглых сталоў, каб вызначыць праблему і знайсці шляхі яе вырашэння. Пленарнае пасяджэнне ў прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў праводзіцца якраз для таго, каб вырашыць тыя пытанні, якія патрабуюць іх удзелу», — растлумачыла віцэ-спікер.

Кожны форум ставіць перад сабой задачы зрабіць супрацоўніцтва Беларусі і Расіі яшчэ больш эфектыўным, падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. «Гэта павінны быць ініцыятывы, прапановы, канструктыўнае партнёрства. Адно з пытанняў, якое мы абавязкова будзем абмяркоўваць сёлета, — эфектыўнасць расходавання сродкаў Саюзнай дзяржавы, бо, на нашу думку, сёння праектаў недастаткова, пры гэтым існуе прафіцыт саюзнага бюджэту. Што, мы не можам прапрацаваць сумесныя праекты? Для гэтага мы павінны прааналізаваць праекты, якія існуюць, — рэалізаваныя альбо якія знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі, і прапаноўваць новыя», — лічыць сенатар.

> Эканамічны складнік па-ранейшаму будзе важны. Гандлёва-эканамічныя адносіны будуць абмяркоўвацца як праз прызму рэгіянальнага супрацоўніцтва, так і на Дзелавым савеце.

На пытанні журналістаў, ці ёсць папярэднія лічбы па колькасці камерцыйных кантрактаў, якія плануецца заключыць на палях форуму, віцэ-спікер адказала: «Лічбы ёсць. Але агучваць мы іх будзем на аргкамітэце напярэдадні форуму, пасля таго, як давядзём унутрыдзяржаўную працэдуру да лагічнага канца». Пры гэтым Мар'яна Шчоткіна заўважыла, што мэта пабіць рэкорд не ставіцца — «гэта не спаборніцтва, і не заўсёды колькасць пераходзіць у якасць». Задача заключаецца ў тым, каб супрацоўніцтва было не дэкларатыўным, каб напаўненне пагадненняў і кантрактаў вызначалася ў сумах і карысці для двух бакоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Развіццё інфраструктуры і падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства

## З якімі пытаннямі звярталіся жыхары Гродзеншчыны да старшыні абласнога Савета дэпутатаў Ігара ЖУКА

**На прамую лінію, якая прайшла ў мінулую суботу, патэлефанавала каля 20 чалавек. Як адзначылі ў абласным Савеце дэпутатаў, большасць пытанняў датычылася тэматыкі добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, навядзення парадку на зямлі, дарожнага рамонту, развіцця сацыяльнай інфраструктуры ў мікрараёнах-новабудоўлях абласнога цэнтра. Былі і званкі з перыферыі, якія ўзнімалі актуальныя тэмы развіцця тэрыторый.**

Гродзенцаў цікавілі, напрыклад, пытанні пабудовы дзіцячых садкоў у мікрараёнах ушчыльненай забудовы па вуліцы Шчорса ды незанятым пакуль лапіку пад будаўніцтва на Дзевятоўцы. Дарэчы, першы адрас мае сваю гісторыю пытання. У свой час гарадскія ўлады прапанавалі жыхарам разгледзець варыянт размяшчэння дзіцячага садка на першым паверсе жылога дома (такі праект ужо паспяхова функцыянуе ў Гомелі), паколькі мэтазгоднасці пабудовы новага няма — раён развіты, у крокавай даступнасці ёсць дашкольныя дзіцячыя ўстановы. Цікавую ідэю вынеслі на грамадскае абмеркаванне, але ініцыятыўная група мясцовых жыхароў дамаглася яе адмены. Аптымальны варыянт размяшчэння садка-трансформера, які мог бы лёгка змяняць сваё функцыянальнае прызначэнне з часам (з разлікам на тое, што раён немалады), не задаволіў асобных грамадзян — яны дамагаліся асобнага садка, а не ўбудаванага. Але такія як паветра патрэбны ў мікрараёнах-новабудоўлях, напрыклад на Альшанцы. Між іншым, пытанне застаецца, таму больш падрабязна на яго дапамогуць адказаць адпаведныя службы гарвыканкама, куды пераадрасаваны ўзнятыя тэмы.

Жыхары згаданага вышэй гродзенскага мікрараёна Альшанка патэлефанавалі з просьбай прывесці ў парадак дарогу ад Паўднёвага рынку да мяжы горада. Супрацоўнік аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі, які прысутнічаў на прамой лініі, падрабязна расказаў, што частка дарогі ўключана ў план гарадскіх рамонтаў вулічнай сеткі, работы выканаюць у канцы лета. Таксама ў найбліжэйшых планах абнаўленне дзіцячай пляцоўкі на вуліцы Крамко ў мікрараёне Вішнявец.

Лідчанін патэлефанаваў з нагоды дома, уключанага ў сёлетнія спісы капітальных рамонтаў. Ён занепакоены тым, што работы яшчэ не пачаліся. Пытанне адрасавалі раённаму ўпраўленню ЖКГ, дзе заяўніку падрабязна ўсё растлумачаць. Другі званок з Ліды датычыўся недастатковага забеспячэння гарачай вадой дома па праспекце Перамогі. Пытанне ўзята на кантроль упраўленнем жыллёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкама.

Некаторыя дамы ў Каробчыцах Гродзенскага раёна абяцалі падключыць да вясковага водаправода, але пакуль гэтага не зроблена. Просьба паскорыць вырашэнне пытання накіравана Гродзенскаму райвыканкаму. А жыхароў вёскі Пушкары таго ж самага раёна турбуе, на іх думку, павышаны шум на размешчаным побач прадпрыемстве, якое працуе ў тры змены. Ім параілі звярнуцца ў санэпідслужбу дзеля вымярэння ўзроўню вытворчых шумоў.

Сёлета ў Слоніме запланавана правядзенне Дня беларускага пісьменства. З гэтай мэтай горад прыводзяць у парадак, у тым ліку і набярэжную канала Агінскага. Гараджане, якія тэлефанавалі старшыні абласнога Савета дэпутатаў, прапанавалі звярнуць увагу і на набярэжную ракі Шчара. На іх думку, тут можна зрабіць прывабную зону адпачынку, пасадзіць дрэвы ды паставіць лаўкі для зручнасці адпачывальнікаў.

Як паведамілі ў аблсавеце, больш падрабязны адказ на пытанні, якія закранулі тэматыку развіцця тэрыторый, усталявання дзіцячых, спартыўных пляцовак у Гродне, даручаны гарадской уладзе і ўзяты на кантроль аблсавета.

# ДАПАМОГА «НА КОЛАХ»

**АСАБЛІВАСЦЬ Віцебшчыны — у самай вялікай колькасці населеных пунктаў. Іх тут больш за 6,2 тысячы. Прыблізна ў двух тысячах — да 10 чалавек, а ў 2/3 — колькасць жыхароў не перавышае 50 чалавек! І жыхароў усіх вёсачак трэба забяспечыць медыцынскімі паслугамі. Калі ФАП закрываюць, як у народзе кажуць, бяда. Але ж з часам вяскоўцы ўпэўніваюцца, што не так ужо і важна, каб медыцынскі пункт быў у крокавай даступнасці. Тая ж «хуткая», калі трэба, значна больш аператыўная і аказвае высокапрафесійную медыцынскую дапамогу.**

**Начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯРКАЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры, нацыянальным развіцці,** падкрэслівае, што, незалежна ад месца пражывання, меддапамога павінна быць аказана на добрым узроўні. Паводле яго слоў, асноўная задача галіны аховы здароўя — забяспечыць даступнасць медыцынскай дапамогі ў адпаведнасці з нарматывамі дзяржаўных сацыяльных стандартаў...

Сенатар упэўнены, што ў глыбінцы пры правільным падыходзе непрынцыпова, якая меддапамога: стацыянарная ці «з колаў». Галоўнае, каб яна аказвалася своечасова.

Наогул, напэўна, мала хто ведае, што ФАП не абавязкова павінен быць у кожнай вёсцы. А звычайна з насельніцтвам каля 700—800 чалавек і з адлегласцю прыкладна пяць кіламетраў да найбліжэйшай медыцынскай установы. Калі ў свой час адкрывалі ФАПы пад лячэнне згаданай вышэй колькасці людзей, а нагрузка з часам паменшылася ў 2—4 разы, дык лагічна, што трэба такую ўстанову закрываць. І там, дзе гэта рацыянальна, медыцынская дапамога аказваецца «з колаў». Дарэчы, на Віцебшчыне арганізавана аказанне хуткай медыцынскай дапамогі на сумежных тэрыторыях, а не па адміністрацыйным прынцыпе. І гэта забяспечвае прыбыццё брыгад да месца выкліку ў аптымальна кароткія тэрміны.

Між іншым, толькі ў мінулым годзе служба хуткай медыцынскай дапамогі вобласці атрымала 14 новых аўтамабіляў. Цікава, што абсталяванне «карэт» — ад віцебскай фірмы.

Наогул, закрыццё ФАПаў — з'ява даволі рэдкая. І ўсё часцей у правінцыі, наадварот, адкрываюць пасля рамонту новыя аб'екты. Напрыклад, у сакавіку адкрылася пасля мадэрнізацыі Курынская амбулаторыя ўрача агульнай практыкі Віцебскага раёна. У населеным пункце жыве каля 900 чалавек. Плюс медустанова да паслуг жыхароў яшчэ каля 25 вёсак. Калі раней у Курыне да медыкаў прыходзілі ў дарэвалюцыйны будынак без выгод, цяпер атрымаць дапамогу можна ў новым месцы, якое знаходзіцца на першым паверсе жылога дома. І амбулаторыя адпавядае ўсім сучасным патрабаванням. Ёсць нават магчымасць дыстанцыйных кансультацый праз інтэрнэт.

Дарэчы, у рэгіёнах Прыдзвіння ёсць цікавы вопыт па фапаўскай тэме. Напрыклад, на Сенненшчыне ў рамках ініцыятывы Беларускага саюза жанчын і ЦРБ «Не губляючы часу» для фапаўскіх медыкаў купілі каля дваццаці электравеласіпедаў. Гэта дазволіла скараціць колькасць выклікаў «хуткай».

У Аршанскім раёне дзякуючы вобласным камп'ютарным тэхналогіям інфармацыя аб пацыенце ўжо вядомая медыкам «хуткай». І зразумела, ёсць магчымасць перадаваць даныя аб стане здароўя тых, каго вязуць у бальніцу.

У Віцебскай вобласці вельмі актыўна праводзіцца паэтапная арганізацыя работы ўчастковай службы па прынцыпе ўрача агульнай практыкі. Летась у вобласці працавалі 232 урачы агульнай практыкі — 58,7 % ад колькасці ўчастковых тэрапеўтаў. Як адзначылі ва ўпраўленні аховы здароўя, для іх створаны ўсе неабходныя ўмовы. Аказанне першаснай медыцынскай дапамогі ў аб'ёме 100 % імі ажыццяўляецца ў Пастаўскім і Верхнядзвінскім раёнах. І набліжаюцца да гэтага ўзроўню ў Браслаўскім і Лепельскім раёнах. Летась у Верхнядзвінску пачала прымаць пацыентаў новая паліклініка на 75 наведванняў у змену, спраектаваная для працы ўрачоў агульнай практыкі. І, як падкрэсліў сенатар Дзяркач, гэта першы вопыт у краіне.

Новыя падыходы да аказання меддапамогі ў глыбінцы дазваляюць значна павысіць якасць паслуг і эканоміць дзяржаўныя сродкі. Вопыт вывучалі расіяне з памежных тэрыторый. І многае ўзялі на заметку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПАКІНУЦЬ НЕЛЬГА ЗАКРЫЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Але колькасць такіх медыцынскіх устаноў у сельскай мясцовасці ўсё ж паступова скарачаецца. За апошнія пяць гадоў іх стала менш на 5 % — з 3056 да 2900. Пры гэтым, як растлумачыў **першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** колькасць сельскіх жыхароў, якая прыходзіцца на адну медыцынскую ўстанову, у сярэднім застаецца стабільнай і вагаецца ў межах 705—713 чалавек. Таму змяншэнне колькасці ўстаноў — вынік скарачэння сельскага насельніцтва. А вясковых жыхароў з 2014 года да 2018-га стала менш на 147 тысяч — з 2193,4 да 2046.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Што датычыцца бальніц сястрынскага догляду, то трэба сказаць: іх колькасць застаецца адносна стабільнай — яна вагаецца ў межах 90—95 адзінак. Прычым Міністэрства аховы здароўя выступае за іх захаванне. Паводле звестак ведамства, да 30 % пенсіянераў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, — адзінокія ці адзінока пражываючыя. І часта зімой іх выратоўвае менавіта знаходжанне ў бальніцы сястрынскага догляду.

Асноўнае ж скарачэнне адбываецца пераважна за кошт ФАПаў. Кожны з іх разлічаны на абслугоўванне 700 вяскоўцаў. У якасці выключэння з улікам асаблівасцяў рассялення, магчыма яго работа пры наяўнасці 500 жыхароў. І скарачэнне неэфектыўна працуючых ФАПаў — непазбежны вынік сённяшніх рэалій і дэмаграфічных змен. Хоць зноў-такі і іх стараюцца не спісваць з рахункаў там, дзе гэта магчыма.

— Не варта бяздумна закрываць ФАПы, як і амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, сельскія участковыя бальніцы і бальніцы сястрынскага догляду, — заклікаў на сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і Савета Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Піневіч. — У структуры нашых расходаў выдаткі на гэтыя ўстановы складаюць не многім больш за 2 %. У прыватнасці, ФАПы і ўрачы агульнай практыкі — гэта ўсяго 1 %, з усім астатнім — не больш за 3 %. Таму істотнай эканоміі мы на гэтым не атрымаем. На наш погляд, такія структуры павінны сыходзіць толькі разам з насельніцтвам, і хочацца спадзявацца, што і яны, і жыхары будуць заставацца ў сельскай мясцовасці. Наяўнасць такой амбулаторнай дапамогі эканоміць вялікую колькасць чалавечых рэсурсаў, — падкрэсліў першы намеснік міністра.

Аднак рэструктурызацыю медыцынскую дапамогу ўсё ж даводзіцца ў адпаведнасці з рэаліямі сённяшняга дня. У прыватнасці, урачэбныя амбулаторыі замяняюць на больш дасканалыя ў плане аснашчэння амбулаторыі ўрача агульнай практыкі. Мяркуецца, што ўкараненне інстытута ўрача агульнай практыкі, якое зараз актыўна ажыццяўляецца ва ўсёй краіне, дазволіць удасканаліць аказанне медыцынскай дапамогі ў першую чаргу на вёсцы. У сувязі з гэтым колькасць урачэбных амбулаторый у Беларусі скарацілася да 19, а амбулаторый урача агульнай практыкі вырасла да 610.

Плануецца, што да 2020 года тэрапеўтаў у нас цалкам заменяць урачы агульнай практыкі. Трэба адзначыць, што гэта больш універсальныя спецыялісты. Такі доктар можа аказаць не толькі тэрапеўтычную, але і афтальмалагічную, неўралагічную, кардыялагічную, эндакрыналагічную, хірургічную і лор-дапамогу. Для гэтага ў яго маюцца і неабходныя веды і навыкі, і дадатковае абсталяванне, у прыватнасці тое, што патрабуецца для праверкі зроку ці дыягностыкі работы сэрца на працягу сутак (холтэраўскае маніторыраванне), а таксама электронныя танометры і тэрмометры, пераносныя электракардыёграфы і іншае. Зразумела, пры неабходнасці кансультацыі вузкага спецыяліста ўрач накіроўвае да яго пацыента.

Акрамя аснашчэння сельскіх амбулаторый сучасным абсталяваннем іх стараюцца паэтапна забяспечыць аўтатранспартам, тэлефоннай сувяззю, надаваць ім функцыі «хуткай медыцынскай дапамогі». Так, напрыклад, у адпаведнасці з Дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі, кожная амбулаторыя ўрача агульнай практыкі і ўчастковая бальніца мае свой аўтатранспарт.

Пры скарачэнні колькасці ФАПаў важную ролю адводзяць раённаму звяну, якое ў сваёй структуры мае цэнтральныя раённыя бальніцы, цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, раённыя дыспансеры і іншыя ўстановы. Радыус тэрыторыі, якую ахоплівае дзейнасць гэтых устаноў, — каля 40 кіламетраў, што дазваляе на працягу гадзіны даехаць да любой вёскі і аказаць медыцынскую дапамогу.

А як жа доступ сельскіх жыхароў да высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі? Вяскоўцы пры неабходнасці могуць атрымаць яе ў спецыялізаваных міжраённых аддзяленнях, якія прымаюць пацыентаў з некалькіх тэрытарыяльна набліжаных раёнаў, а таксама ў абласных і рэспубліканскіх бальніцах і навукова-практычных цэнтрах.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Працэс аптымізацыі медыцынскіх арганізацый на вёсцы, на жаль, непазбежны, бо з'яўляецца следствам дэмаграфічных працэсаў — скарачэння колькасці сельскага насельніцтва і яго старэння, канстатуюць у Міністэрстве аховы здароўя. У той жа час медыцынскія тэхналогіі ўдасканальваюцца, развіваецца і інфраструктура вёскі, і сельскае насельніцтва не застанецца без медыцынскай дапамогі. Рэзервам павышэння яе даступнасці ў міністэрстве бачаць удасканаленне лагістыкі і развіццё дарожнай сеткі, а таксама паляпшэнне забеспячэння арганізацый аховы здароўя.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Тэлесеткі

# ПРЫСТУПКІ ДА АЛІМПА

**МАШТАБНЫ рэспубліканскі дзіцячы тэлеконкурс «Талент краіны», які ладзяць сумесна тэлеканал АНТ і спецыяльны фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама Міністэрства культуры Беларусі і дзяржаўная акадэмія музыкі, рыхтуецца да запуску новага, ужо чацвёртага па ліку, сезона.**



Да ўдзелу ў праекце арганізатары запрашаюць адораных дзяцей з усіх куткоў краіны — юных выканаўцаў і музыкантаў, танцораў і акрабатаў, дэкламатараў і акцёраў ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў уключна. Допускающа і калектыўныя выступленні — але не больш чым за тры чалавекі.

Папярэднія адборы ў тэлепраект ужо традыцыйна будуць праходзіць у Мінску, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (вуліца Інтэрнацыянальная, 30). 25 мая з 10 да 18 гадзін тут чакаюць вакалістаў, 26 мая — танцораў (народная, класічная і сучасная харэаграфія), 1 чэрвеня — інструменталістаў, 2 чэрвеня — артыстаў арыгінальнага жанру (акцёрскае майстэрства, мастацкая дэкламацыя, цыркавое мастацтва). Анкета ўдзельніка запаўняецца на месцы ў дзень адбору. Падрабязнасці па тэлефоне +375 17 284-34-11.

Як і раней, галоўная ўзнагарода праекта для пераможцаў у малодшай і старэйшай узроставай катэгорыях — грашовы прыз ад спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

У мінулых сезонах праекта, нагадаем, перамогу атрымлівалі маленькая актрыса і чытальніца з Віцебска Мілана Хатулёва і скрыпачвіртуоз Нікан Мазоль (2018), піяніст Багдан Бабіч і юная «зорачка» балета Ксенія Косава (2017, абодва — Мінск), юная піяністка з Салігорска Сафія Курловіч і піяніст Мікіта Шастакоў з Мінска (2016).

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**




УНП 690262964


## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 69

Беларускія шахматныя кампазітары Валерый Разнікін (г. Мінск) і Вячаслаў Красічонак (г. Бабруйск) пасябравалі сорак пяць гадоў таму, сумесна склалі шэраг задач. На жаль, у 2016 годзе Валерый Іванавіч пайшоў з жыцця. А днямі яго суаўтар даслаў нам трохходоўку ***(гл. дыяграму),*** над якой складальнікі калісьці пачыналі працаваць разам, але завяршыць твор давялося толькі аднаму з іх. Згодна з правіламі і этыкай шахматнай кампазіцыі гэта калектыўная задача абодвух аўтараў.



**Белыя:** Крh1, Фе2, Ла6, Лh6, Сg7, Кb3, пп. d3, d4 (8).

**Чорныя:** Крd5, Фb5, Сf5, Сh2, пп. b4, c7, d7, g4, h3 (9).

Мат за 3 хады.

*Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.*

* * *

У Анталіі (Турцыя) адбыўся чэмпіянат Еўропы сярод жанчын (130 удзельніц з 32 краін). Многія шахматысткі, дарэчы, мелі «мужчынскія» званні, якія атрымаць складаней. Так, гросмайстраў было 13 «мужчынскіх» і 26 «жаночых», міжнародных майстроў — адпаведна 25 і 24, майстроў ФІДЭ — 2 і 21. Па 8 балаў з 11 набралі пяць удзельніц. Па дадатковых паказчыках чэмпіёнкай стала Аліна Кашлінская (Расія), «серабро» ў Мары Себаг (Францыя), «бронза» — у Элізабэт Пэтц (Германія), а па-за прызавой тройкай засталіся Іна Гапоненка (Украіна) і экс-чэмпіёнка свету Антуанэта Сцяфанава (Балгарыя). З трох беларусак Вольга Бадэлька — на 41-м месцы (6 балаў), Наталля Кусянкова — на 60-м (6), Яна Ільючок — на 98-м (4,5).

* * *

Ягор Сіліч з Віцебска выйграў у Анталіі чэмпіянат свету сярод школьнікаў ва ўзроставай катэгорыі да 13 гадоў. У рэспубліканскім турніры «Белая ладдзя» тры прызавыя месцы заваявалі адпаведна гімназія № 1 г. Бабруйска, СШ № 8 г. Кобрына і гімназія № 29 г. Мінска. На сваіх дошках першыя месцы занялі Глеб Галкін (Мінск), Дзяніс Зарэцкі (Кобрын), Мікіта Дыль і Ксенія Зелянцова (Бабруйск).

* * *

Наймацнейшы беларускі рашальнік шахматных кампазіцый Аляксандр Булаўка з Клічава перамог у чэмпіянаце Славакіі (14 удзельнікаў з 6 краін), а мінчанін Мікалай Сігневіч фінішаваў там пятым. Праз два тыдні А. Булаўка заваяваў бронзавы медаль на адкрытым чэмпіянаце Германіі (29 рашальнікаў з 10 краін), дзе першае і другое месцы занялі гросмайстры — адпаведна Барыс Тумес (Германія) і Эдзі ван Бірс (Бельгія).

* * *

Рашэнне пазіцыі з мінулага выпуску: 1. С:h7+ Кр:h7 2Лg4, і чорныя здаліся. Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Сядзі і глядзі

# ТРЫ НАГОДЫ ЎКЛЮЧЫЦЬ ТЭЛЕВІЗАР

## ЖАНЧЫНЫ

Дакладней, беларускія спартсменкі. Менавіта пра іх працягвае расказваць Ганна Эйсмант ужо ў трэцім сезоне сваёй аўтарскай праграмы «Жанчыны і спорт». Для новых выпускаў праекта здымачная група Белтэлерадыёкампаніі



пабывала на малой радзіме біятланісткі Надзеі Скардзіна — у расійскім Сестрарэцку, трапіла ў закулісе нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» разам з фрыстайлісткай Ганнай Гуськовай *(на фота),* а таксама ў дэпартаменце развіцця футбольнага клуба БАТЭ разам з яго кіраўніком, вядомай баскетбалісткай Наталляй Марчанка. А чатырохразовую алімпійскую чэмпіёнку па фехтаванні Алену Бялову вядучая перанакала... выйсці на подыум у якасці мадэлі.

«Перадусім мы падкрэсліваем у кожнай з нашых гераінь-спартсменак жанчыну, у якой ёсць сям'я, сябры і блізкія людзі, якая спалучае сілу і прыгажосць і мае за плячыма не толькі багаты спартыўны вопыт, але і цікавую і непаўторную жыццёвую гісторыю», — удакладняе канцэпцыю праграмы яе аўтар і вядучая Ганна Эйсмант. Што новага з'явілася ў фармаце папулярнага тэлепраекта, а што засталося нязменным, глядзіце на «Беларусь 1» штотыднёва па панядзелках — увечары, адразу пасля «Панарамы».

## ЮБІЛЕЙ

25 мая споўніцца 70 гадоў Леаніду Барткевічу — заслужанаму артысту БССР, салісту знакамітага мулявінскага ВІА «Песняры» ў 1970—1980, 1999—2003 гг., а таксама заснавальніку ўласнага калектыву пад той жа брэндавай назвай «Песняры».



Гэта яркі голас Барткевіча мы чуем на старых пласцінках з песнямі «Александрына», «Бярозавы сок», «Вераніка» і «Молодость моя — Белоруссия». А яшчэ менавіта па ягоным — выпускніка архітэктурнага тэхнікума — дыпломным праекце быў спраектаваны сталічны кінатэатр «Кастрычнік». А яшчэ ён быў жанаты са знакамітай алімпійскай чэмпіёнкай па гімнастыцы Вольгай Корбут, разам з якой пераехаў жыць у ЗША... Пра амерыканскую эпапею і ролю ў расколе «Песняроў», напісанне мемуараў і здымкі ў кіно, узнагароды і любімых жанчын — словам, пра падрабязнасці і акалічнасці жыцця Леаніда Барткевіча, якіх прыхільнікі наогул не ведалі ці добра падзабылі, раскажа дакументальны фільм — у вячэрнім эфіры тэлеканала «Беларусь 3» акурат у дзень нараджэння музыканта.

## КЛАСІКА

У наступную нядзелю, 26 мая, канал «Беларусь 3» прапануе гледачам усходнееўрапейскую прэм'еру — канцэрт-рэканструкцыю «Страсцей па Марку» Іагана Себасцьяна Баха для салістаў, хору і аркестра. Ён быў адноўлены нямецкім кампазітарам і клавесіністам Ёрнам Бойзенам і запісаны ў красавіку творчай групай медыяхолдынга ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі.



На тое, каб аднавіць згублены шэдэўр духоўнай музыкі (а для гэтага вывучыць філасофскія трактаты, кнігі па эстэтыцы і рыторыцы эпохі барока), Бойзену спатрэбіўся год карпатлівай працы. Кампазітар сам напісаў страчаныя рэчытатывы ў барочным стылі, палічыўшы недапушчальным рабіць штучныя ўключэнні з іншых твораў Баха, але пры гэтым захаваў большую частку музычнага тэксту «Страсцей».

У міжнародным культурнаадукацыйным праекце таксама ўзялі ўдзел кіраўнік і прадзюсар Яўген Бушкоў, нямецкія тэнар Бенджамін Глаубіц і бас-барытон Джуліян Рэдлін, салісткі Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі сапрана Таццяна Гаўрылава, меццасапрана Наталля Акініна, хор Беларускай акадэміі музыкі, Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі і ансамбль расійскіх музыкантаў, якія валодаюць тэхнікай ігры на інструментах эпохі барока.




# Сваім одумам не дапяць...

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам,

**ці ведалі вы, што:**

**абало́на —** 1) частка даліны ракі, якая ў паводку заліваецца вадою; 2) слой драўніны сасны, што знаходзіцца паміж стрыжнем і карою;

**выціна́ць —** 1) старанна выводзіць якую-небудзь мелодыю, гук; найграваць, напяваць; 2) вырэзваць з паперы ці якога іншага матэрыялу што-небудзь;

**дапя́ць —** 1) дайсці, дабрацца куды-небудзь; 2) дамагчыся, дасягнуць чаго-небудзь; 3) зразумець што-небудзь, разабрацца ў чым-небудзь;

**кана́ць —** 1) паміраць у муках, канчацца *(у пераносным значэнні* — выражае найвышэйшую ступень хацення, жадання); 2) *(пераноснае значэнне)* канчацца, набліжацца да канца;

**навярэ́дзіць —** стаміць, натрудзіць да хваравітага стану якую-небудзь частку цела;

**о́дум —** стан разважання, засяроджанасці, паглыблення ў сябе, у свае думкі;

**паджга́ць —** 1) пакусаць, параніць джалам, хабатком; 2) хутка пайсці, пабегчы; паімчацца;

**падшыва́нец —** хлапчук (звычайна падлетак);

**суса́ль —** тонкія пласцінкі золата, срэбра, волава, медзі, якія служаць для дэкаратыўнага аздаблення якіх-небудзь вырабаў.

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Бацькаў бераг» (16+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Тры песні для Папялушкі». 1—4-я серыі (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Жанчыны і спорт». Дак. фільм.
**22.20 Серыял «След» (16+).**
**23.55** «Арэна».
**0.50** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Даравааць» (16+).**
**10.15** «Капейка ў капейку» (12+).
**11.05** «Свет навыварат». Японія (16+).
**12.00** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**12.50** Анімацыйны фільм «Тайна Чырвонай планеты» (0+).
**14.15 Меладрама «Вікі Крысціна Барселона» (16+).**
**16.00 Баявік «Хуткасць: аўтобус 657» (16+).**
**17.40** «Пагоня за смакам» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**21.10, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**22.50** «Хадзі сюды і танцуй».
**22.55 Серыял «Жаночы доктар» (16+).**
**23.50** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабрaранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Ножкі ў фасолі, яблычны дэсерт.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.15, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 16.30 «Штармавое папярэджанне». Маст. фільм (12+).**
**10.40** «Навукаманія» (6+).
**11.00** «Архітэктура Беларусі».
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Алег Даль (12+).
**12.50** «Спявае Беларусь».
**13.45** «Наперад у мінулае».
**14.05, 19.25** «Вызваленне». «Пражская наступальная аперацыя» (12+).
**14.35, 21.45 «Варыянт «Амега». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**15.50** «Люблю і памятаю». Народны артыст СССР Леў Дураў.
**17.50** «Легенды музыкі». Эдуард Хіль (12+).
**18.10** Канцэрт ВІА «Поющие гитары». «Нет тебя прекрасней».
**19.50** «Тэатр у дэталях». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Саламея».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Артэфакты». Пояс Вітаўта [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — ЗША.
**8.55, 23.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**9.25** Вынікі тыдня.
**10.05** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Баку.
**12.10** Гандбол. Кубак Беларусі. Матч за 3-е месца.
**13.45** Вялікі спорт.
**14.30** Тэніс. WTA. Рым. Фінал.
**16.35** Кікнадзе. Меркаванне.
**17.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя — Латвія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.30** Бокс. Сусветная суперсерыя. 1/2 фіналу. І. Баранчык (Беларусь) — Д. Тэйлар (Шатландыя).
**21.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Данія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**0.05** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30, 23.35** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Вой, ма-мачкі!..» (12+)**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Дом з ліліямі» (12+).**
**15.00** «Давай пажанімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай кажуць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.10, 0.00 Серыял «Мама Лора» (16+).**
**0.35 Серыял «Добрыя рукі» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40 «Фарца». Серыял (16+).**
**12.35, 21.20, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Невераґодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.45** «Дзень сакрэтных праектаў» (16+).
**15.15, 16.50 «Балабон». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.25** «Мінтранс» (16+).
**1.00** «Як устроены Сусвет» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Не жаночая справа» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 3.00** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.25** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.15** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.00** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.40, 0.10 Серыял «Двайная суцэльная» (16+).**
**3.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**4.20 Маст. фільм «Антон Іванавіч сярдуе» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.45** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30** «1/8 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Усё магло быць інакш» (12+).**
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.30** «Гісторыі рамонту» (0+).
**7.10** «Цуд тэхнікі» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50** «Доктар Святло» (16+).
**9.40** «За гранню» (16+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.05** «Малая зямля» (16+).
**11.55, 23.10** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**17.05** «ДНК» (16+).
**18.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.35** Сёння. Галоўнае.
**19.50 Серыял «Юрысты» (16+).**
**20.50 Серыял «Кансультант» (16+).**
**22.45** «НЗ.by».

## 8 канал

**7.00, 16.00, 19.00, 21.05, 0.05** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** М/с «Русалачка» (0+).
**7.25** «Гумарынка».
**7.30 Фантастыка «Вартавыя Галактыкі».**
**9.30, 19.05 Серыял «Крык савы» (16+).**
**10.30** Дак. фільм «Мабільныя дадаткі».
**11.00 Драма «Да мяне, Рэкс!»**
**13.00, 20.00 Серыял «Смяротная зброя» (16+).**
**13.45 Драма «Усе грошы свету» (18+).**
**16.35 Кінастудыя «Беларусьфільм» прадстаўляе. Маст. фільм «Наш бранявоз» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Дзяўчына, якая падрывала паветраныя замкі» (18+).**
**23.30** Дак. фільм «Мабільныя дадаткі».





## ВТБ

**6.05, 3.45** «Дурні і дарогі» (16+).
**6.50, 5.00** «Лаві момант» (16+).
**7.25** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.55** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «Чычылэнд» (0+).
**9.35** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.00, 18.50, 22.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.40** «Наш рамонт» (16+).
**11.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00** «Слава богу, ты прыйшоў!» (16+)
**15.00** Серыял «#СеняФедзя-2» (16+).
**17.00** Анімацыйны фільм «Балерына» (6+)
**20.20** Фантастыка «Успомніць усё» (16+).
**23.30** «Пары на Канары» (16+).
**0.20** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+).
**1.20** «Хачу верыць!» (16+)

## Культура

**6.30** «Пунсовая кветачка», «Васіліса Мікулішна», «Пра бегемота, які баяўся прышчэпак». М/ф.
**7.55** «Сіта і Рама». Серыял [СЦ].
**10.10** «Звычайны канцэрт».
**10.40** «Капітанская дачка». Маст. фільм [СЦ] (6+).
**12.20** «Пісьмы з правінцыі». Мцэнск [СЦ].
**12.50, 1.20** «Дыялогі пра жывёл. Лора Парк. Тэнэрыфэ» [СЦ].
**13.30** «Мікалай Пржэвальскі. Экспедыцыя даўжынёю ў жыццё». Дак. фільм [СЦ].
**14.30** Да 70-годдзя з дня нараджэння Любові Палішчук. «Лінія жыцця» [СЦ].
**15.20** «А чой-та ты ў фраку?» Спектакль тэатра «Школа сучаснай п'есы». Запіс 1993 года.
**16.30** «Карціна свету».
**17.15** «Блізкае кола Ісаака Штокбанта».
**18.15** «Рамантыка рамансa». Галіне Каравой прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**13.40** Эд з тэлевізара (12+).
**16.05** Законы прываблівасці (16+).
**20.10** Машына часу (12+).
**22.05** Разня (16+).
**23.40** Адплата (18+).
**2.00** Без заганы (12+).
**4.10** Арбіта 9 (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Службовы раман. Наш час (16+).
**8.20** Каханне з акцэнтам (16+).
**10.30** Тайна чатырох прынцэс (6+).
**12.25** Пра каханне (16+).
**14.25** Снядaнак у таты (12+).
**16.20, 4.20** Свірыдавы (16+).
**18.15** ПіраМММіда (16+).
**20.20** Ласкавы май (16+).
**22.35** Бармен (16+).
**0.25** Вар'яцкая дапамога (16+).

### National Geographic

**2.40** Апельсінавы сок (16+).
**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.20, 12.45** Невядомы Кітай (16+).
**7.10** Цуды інжынерыі (16+).
**8.00, 18.10** Дзікі тунец (16+).
**10.25** На плытах па Юкане (16+).
**11.10, 16.40, 3.40** Аўта-SOS (16+).
**13.35** Асушыць акіян (16+).
**14.20, 19.45** Рэальнае паранармальнае (16+).
**15.05, 21.20** Варожая планета (16+).
**15.50, 2.55** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**19.00, 22.10, 1.20, 4.25** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**20.30** Сіла племені (16+).
**23.00** Мяжа (16+).
**23.45** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна (16+).
**0.35** Ліхтугі за мяжой (16+).
**2.10** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**5.15** Гульні розуму (16+).

### Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 18.30, 0.00, 1.50** Залатая ліхаманка (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Вялікі махінатар (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**13.00** Разбуральнікі легенд (16+).
**19.25** Ратаўнікі-цяжкавагікі (16+).
**20.20, 5.30** Іржавая імперыя (12+).
**0.55, 6.20** Хакер у дзікай прыродзе (16+).
**2.45** Гаражны рамонт (12+).
**3.40** Сібір: ДНК Ледніковага перыяду (12+).
**7.10** Забытая інжынерыя (12+).

РЭПАРЦЁР

# БУДНІ СЕЛЬСКАГА ЎРАЧА

## З якімі наступствамі аптымізацыі прыходзіцца яму сутыкацца падчас работы

**НЕЖКАЎСКАЯ амбулаторыя ўрача агульнай практыкі пачынае прыём з паловы дзявятай раніцы, але ўжо а восьмай у яе калідорах робіцца мнагалюдна. Камусьці трэба аналізы здаць, камусьці пракансультавацца з урачом, камусьці прайсці фізіяпрацэдуры.**

### Найлепшыя ў вобласці і не толькі

Нежкаўская амбулаторыя абслугоўвае 29 вёсак, да самага крайняга населенага пункта — 16 кіламетраў. На ўчастку жывуць 2723 чалавекі. З іх 847 пенсіянераў і 417 дзяцей, шмат якім няма яшчэ і года. Амбулаторыя аказвае поўны комплекс паслуг, як і любая іншая паліклініка. Тут ёсць свая лабараторыя, дзе можна зрабіць аналіз крыві, у тым ліку на глюкозу і халестэрын. Для больш глыбокага даследавання таксама не спатрэбіцца ехаць у Бялынічы. Забор крыві зробяць на месцы і адправяць у райцэнтр. Пры амбулаторыі працуе працэдурны кабінет, існуе дзённы стацыянар. З Магілёва прыязджае перасовачны флюарограф. На ўзбраенні партатыўны апарат для правядзення ЭКГ. Калі кардыяграма насцярожвае, яе перададуць у райцэнтр, каб вузкі спецыяліст зрабіў сваё заключэнне. Адрозненне ад звычайнай паліклінікі толькі ў тым, што штат меншы. З медперсаналу тут працуе адзін тэрапеўт, педыятр на паўстаўкі, фельчар, чатыры медыцынскія сястры і лабарантка.

Але на цяжкасці тут не скардзяцца. Наадварот, дэманструюць выдатныя паказчыкі ў рабоце. Па выніках дзейнасці за мінулы год Нежкаўская амбулаторыя прызнана найлепшай у вобласці і ў краіне. Дарэчы, некалькі гадоў таму яна ўжо была першай у краіне. Наогул, уся сцяна ў калідоры ў дыпломах і граматах. За проста так такія ўзнагароды не даюць.



З павагай да пацыента. Фельчар Святлана КАЗАКОВА.

— Паказчыкаў, па якіх вызначаюць лепшых, шмат, — сціпла кажа **загадчыца амбулаторыі Марыя ЗАЙЦАВА**. — Сярод іх нараджальнасць, смяротнасць, анказапушчанасць. Мы ўсё гэта адсочваем. Прымушаем людзей праходзіць дыспансерызацыю, нават запрашэнні дасылаем. Некаторыя жыхары на іх не рэагуюць, але мы іх рознымі спосабамі зацікаўліваем да нас прыйсці. Тлумачым, што пасля 40 гадоў гэта абавязкова трэба рабіць. Хаця непрыемныя хваробы выяўляюцца і ў зусім яшчэ маладых.

Марыя Зайцава працуе ў амбулаторыі восем гадоў. Да гэтага лячыла людзей у Дрыбінскім раёне, куды трапіла па размеркаванні пасля вучобы ва ўніверсітэце, і ў Магілёве. Але сямейныя абставіны прымусілі памяняць горад на вёску.

### На прыём да ўрача

Асноўны кантынгент — гэта жыхары аграгарадка Вішоў. Але хапае пацыентаў і з навакольных вёсак. Напрыклад, з Лямніцы, дзе некалькі гадоў таму закрылі ФАП.

— У лепшыя часы ў нас былі і школа, і пошта, і ФАП — зараз нічога не засталося, — уздыхаюць сужэнцы Любоў Віктараўна і Мікалай Уладзіміравіч, што прыехалі на прыём. — Раней было дзе і ціск памераць, і таблетку купіць, і кропельніцу зрабіць — цяпер па ўсё гэта трэба сюды ехаць або ў Бялынічы. Тры разы на месяц прыязджаем — то ногі забаляць, то спіна, то яшчэ якая навала. Вось зараз уколы прызначылі, таму мы тут, бо хто ж іх зробіць? Заадно трэба лекі купіць ад ціску. Гэта хвароба ўжо невылечная, таблеткі трэба піць пастаянна. А транспарту не хапае: адзін толькі аўтобус па аўторках ездзіць. Ды і машыну не вельмі проста знайсці, не кожны пагадзіцца падвезці.

Марыя Зайцава старым спачувае, але што рабіць, калі колькасць насельніцтва скарачаецца.

— Калі на ўчастку 150 чалавек, ФАП трымаць вельмі стратна, — кажа ўрач. — Ад нас Лямніца не так далёка, кіламетраў 6—7. Па гарадскіх мерках — не адлегласць, там таксама не ўсе могуць хутка да паліклінікі дабрацца. А ў садок некаторыя возяць дзяцей наогул з аднаго канца горада ў другі. Нязручна, але ж што рабіць? ФАПы ў вёсках, якія выміраюць, — таксама вялікая раскоша. 150 чалавек на аднаго фельчара — гэта мізэр. Нагрузка на фельчара амбулаторыі ў 10 разоў большая. Да таго ж выклікі, якія паступаюць на ФАП, усё роўна абслугоўвае амбулаторыя. Фельчару няма на чым ездзіць.

### Без увагі ніхто не застаецца

У фізіятэрапеўтычным кабінеце Нежкаўскай амбулаторыі аншлаг. Ён працуе паўтары гадзіны штодзень, і трэба паспець прайсці прызначаныя ўрачом працэдуры. Вольга Мажарцава выконвае абавязкі медсястры фізіякабінета і фельчара ФАПа ў Свяцілавічах.



Аляксандр ШОБІКАЎ дае слушную параду.

— Сумяшчаць складана, — прызнаецца суразмоўца. — Але на чвэрць стаўкі ў амбулаторыі пражыць няпроста. Паслугамі ФАПа карыстаюцца жыхары яшчэ дзвюх вёсак — Краснае і Студзёнкі, усяго на ўчастку каля 800 чалавек. Радыус абслугоўвання 8 кіламетраў. За дзень праходжу па 15 кіламетраў — аднаму трэба ціск памераць, другому ўкол зрабіць, трэцяга агледзець. На мне продаж лекаў, патранаж дзяцей, абслугоўванне пацыентаў дома. Людзі тэлефануюць і паведамляюць, што самі не ў стане прыйсці, і я бягу. Шмат ляжачых хворых, нетранспартабельных. Раней 10 гадоў працавала загадчыцай ФАПа ў Лямніцы, але людзей там рабілася ўсё менш і менш. Апошнім часам нават праз дзень прыходзілі на работу. Пацыентаў мала, зарплата невялікая.

Дзіцячая аўдыторыя на асаблівым рахунку. Для яе нават ёсць асобны ўваход у амбулаторыю. Прыём вядзе вопытны ўрач-педыятр Аляксандр Шобікаў. Ён працуе на паўстаўкі, і вольнага часу па размовы ў яго амаль няма. Назіраю збоку, як ён аглядае трохмесячнага малыша і кансультуе яго маці. Маладая жанчына літаральна з ходу паспявае падзяліцца добрымі словамі ў адрас урача і падзякаваць праз газету за прафесійнае абслугоўванне. А на чарзе ўжо новы пацыент. У дзяўчыны не зажывае крывавы мазоль на пятцы. Пакуль урач яе кансультуе, паступае выклік на дом.

— Вось так і працуем, увесь час у справах, — коратка кажа педыятр. — Усяго на ўчастку 392 малышы. Дзеці ў асноўным вішоўскія. Але ездзім абслугоўваць малых пацыентаў і на вёску. Калі патрэбна дапамога вузкіх спецыялістаў або больш дасканалае абследаванне, вязём у Бялынічы. Без увагі ніхто не застаецца.

### ФАП не заменіць увагі блізкіх

А мы разам з фельчарам амбулаторыі Святланай Казаковай едзем у Сіпайлы ратаваць 93-гадовую бабульку, у якой гіпертанічны крыз. Яе дачка па тэлефоне паведаміла, што ў жанчыны высокі ціск і яго немагчыма збіць. У вялікай фельчарскай сумцы — танометр і лекі на ўсе выпадкі жыцця.

На ўзбраенні амбулаторыі непераможны «ўазік», які ў народзе называюць «бохан» або больш пяшчотна — «булка». Умовы ўнутры спартанскія, але тутэйшым медыкам да цяжкасцяў не прывыкаць. Едзем, падскокваючы на ўхабах. Прасёлкавыя дарогі, у адрозненне ад цэнтральных, асфальтам не пакрытыя. Дом знайшлі, можна лічыць, з першай спробы.

У пярэдняй на канапе ляжыць жанчына, але гаспадыня кліча прайсці далей. Кажа, што гэта не 98-гадовая цётка, а дапамога патрэбна маці. Пакуль фельчар разбіраецца з пацыенткай, знаёмлюся бліжэй з бабуляй. Высветлілася, што да прыезду сюды яна жыла ў Магілёве. Там з медыцынскай дапамогай наогул ніякіх праблем, а вось без увагі блізкіх жыццё аказваецца яшчэ горшым.

— Я адна жыла, страціла прытомнасць і доўга ляжала на падлозе, на наступны дзень усё паўтарылася, — паскардзілася жанчына. — Прыйшлося звярнуцца да пляменніцы. Яна мяне сюды і забрала. Лічы, дамоў вярнулася, мы ж з сястрой тут нарадзіліся.

Гаспадыня дома, дарэчы, сама ўжо пенсіянерка. Але сіл даглядаць і маці, і цётку яшчэ хапае. Пра маці расказвае, што ў той праблемы пачаліся, калі яна ўпала. Спачатку моцна ацякла нага, а калі ацёк спаў, на твары з'явілася язва і пайшла кроў. А яшчэ ціск пастаянна падымаецца і галава баліць. Фельчар мерае ціск, а ён у бабулі 160 на 90, дае таблетку і робіць укол.

Хутка палягчэе, — супакойвае яна пацыентку. Потым дае парады яе дачцэ і пакідае рэцэпт. Трэба вяртацца ў амбулаторыю і дапамагаць урачу весці прыём. А там зноў адпраўляцца да кагосьці на дапамогу.

**Павел МАНЬКО, галоўны ўрач Бялыніцкай цэнтральнай раённай бальніцы:**

— У нашым раёне для абслугоўвання дзевяці тысяч сельскага насельніцтва працуе пяць амбулаторый урача агульнай практыкі і дзесяць ФАПаў. Раней амбулаторыі ўзначальвалі ўчастковыя ўрачы-тэрапеўты, зараз іх змянілі ўрачы агульнай практыкі. Гэта значна паляпшае якасць паслуг, бо ўрачы агульнай практыкі валодаюць базавымі практычнымі навыкамі пры аказанні паслуг па вузкіх спецыяльнасцях. Напрыклад, могуць зрабіць першасную хірургічную апрацоўку ран, накласці швы, пракансультаваць як неўролаг або оталарынголаг, адным словам на першым этапе здольны аказаць шматпрофільную амбулаторную дапамогу. І забяспечанасць такімі спецыялістамі на сяле ў Бялыніцкім раёне стапрацэнтная. Горш становішча з транспартам. Летась змаглі купіць за сродкі мясцовага бюджэту адну машыну хуткай медыцынскай дапамогі. Сёлета з абласнога бюджэту абяцаюць выдзеліць фінансы на набыццё машын для раёна. Патрэба ў гэтым вельмі вялікая. Бо транспарт у раёне амаль цалкам зношаны.

**Аляксандр ЖЫЛІН, начальнік упраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама:**

— За апошнія пяць гадоў у вобласці было закрыта 46 ФАПаў. Гэта заўсёды вымушаная мера, на якую прыходзіцца ісці, калі колькасць насельніцтва зніжаецца прыблізна да 70 чалавек. Мы зацікаўлены ў тым, каб у кожнага, як казаў Прэзідэнт, была даступнасць паслуг і першаснай медыка-санітарнай дапамогі. Альтэрнатыва ФАПу — перасовачная форма работы. Існуюць графікі выезду ў населеныя пункты і прыёму грамадзян на базе дамоў сацыяльных паслуг, напрыклад. Перасовачны ФАП, вядомая рэч, не заменіць стацыянарнага, але там, дзе практычна не засталося насельніцтва, — гэта выйсце. Мы таксама думаем аб набыцці аднаго такога аўтамабіля для абслугоўвання аддаленых вёсачак паўднёва-ўсходняга рэгіёна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**



Нежкаўская амбулаторыя ўрача агульнай практыкі прызнана найлепшай у вобласці і краіне.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# Замест ФАПа — Дом сацыяльных паслуг

## Вясковая грамада ўзяла ў часовае карыстанне прыватны дом

**У Чамялах гаспадыні да веснавых свят рыхтавалі не толькі ўласнае жыллё. У вясковым грамадскім доме таксама наводзілі прыгажосць перад Вялікаднем. Разам са старастам Ганнай Емельяновіч жанчыны перамылі-перапрасавалі ўсе фіранкі, вымылі падлогу, прыбралі. Сюды напярэдадні свят прыязджаў айцец Цімафей паспавядаць старых і нямоглых, асвяціць велікодныя стравы.**

Гэта перад вялікімі святамі Дом сацыяльных паслуг у вёсцы становіцца месцам сустрэч і гутарак са святаром. А так ён найбольш служыць своеасаблівым філіялам медыцынскай установы. Часцей за ўсё раз на месяц, па папярэдняй дамоўленасці са старастам, які загадзя вядзе запіс пацыентаў на прыём, сюды прыязджаюць доктар з медсястрой з Даманаўскай амбулаторыі. У гэты дзень абавязкова бывае і выязная аптэка, каб людзі маглі купіць прызначаныя прэпараты.

Урач Алена Дрозд праводзіць прыём пацыентаў. Для агляду і маніпуляцый абсталявана медыцынская кушэтка. Тут па меры неабходнасці робіцца кардыяграма сэрца, у наведвальнікаў бяруць кроў на аналіз. Потым Алена Іванаўна наведвае інвалідаў першай і другой груп і тых, хто па стане здароўя не змог прыйсці на прыём, але папярэдне прасіў аб візіце доктара.

Медсястра агульнай практыкі Даманаўскай амбулаторыі Ала Паўловіч сказала, што староста ў іх найлепшы рэгістратар у сваёй вёсцы:

— Ганна Мікалаеўна ўсіх абыдзе — хто на дыспансерным уліку, хто хварэе, складзе спісы пацыентаў, якія прыйдуць на прыём і якіх трэба наведаць дома. Таму да візіту ўрача ўсё дакладна і акуратна падрыхтавана. Калі прыязджаем, адразу пачынаем працаваць, час на арганізацыйныя моманты ды розныя ўдакладненні траціць не трэба. А яны, актывісткі гэтага дома, заўсёды печку напаляць, падлогу памыюць, каб было камфортна і нам, і пацыентам.



Ганна ЕМЕЛЬЯНОВІЧ і старшыня сельскага Савета Ігар КАРПОВІЧ.

Цікавая гісторыя гэтага грамадскага дома ў Чамялах. Нават не зусім звычайная. Часцей пад Дом сацыяльных паслуг адводзяць былыя клуб, бібліятэку, нават школу альбо краму. Тут названых аб'ектаў няма. А магазін райспажыўтаварыства, на шчасце, не зачыняўся. Дык вось, у цяперашнім Доме сацыяльных паслуг некалі пражывалі гаспадары па прозвішчы Монцік. Мелі вялікую сям'ю. Дзеці даўно выраслі і раз'ехаліся, бацькі пайшлі з жыцця. Найбліжэйшая спадчынніца домаўладання жыве ў Івацэвічах. Жанчына ўжо мае даволі сталы ўзрост, даўно на пенсіі. Дом даглядаць дачцэ гаспадароў апошнім часам стала цяжкавата, а і прадаваць бацькоўскую хату яна не надта хоча, усё ж памяць. Аб гэтым неяк падчас аднаго з прыездаў пагаварыла са старастам. І Ганна Мікалаеўна ёй прапанавала такі варыянт: уласніца перадае дом у карыстанне вясковай грамады. А грамада, у сваю чаргу, падтрымлівае парадак, праводзіць неабходны бягучы рамонт як знутры, так і звонку. Фармальна ж па законе домаўладанне застаецца ва ўласнасці спадчынніцы. Так і дамовіліся.

Пасля дасягнутай дамоўленасці жанчыны сабраліся і правялі нешта накшталт суботніка. Адразу зрабілі генеральную прыборку. Па-першае, беражліва абышліся з тым, што засталося пасля гаспадароў. Па-другое, прынеслі і дабавілі свае рэчы. У доме паявіліся прыгожыя абрусы, на вокнах — новыя фіранкі. Падлогу пафарбавалі. Нехта здагадаўся са старога клуба даставіць драўляныя крэслы. Гэта на той выпадак, калі праводзіцца сход альбо святочнае мерапрыемства і збіраецца многа людзей. Гутаркі па бяспецы тут праводзяць супрацоўнікі міліцыі і пажарнага нагляду. Ёсць дзе сабрацца, пасядзець у выхадны ці святочны дзень з гарбатай. Для гэтага набылі чайнік.

У двары вакол дома таксама парадак, нядаўна паднавілі калодзеж. А на градзе з боку вуліцы павылазілі шматгадовыя кветкі. Іх даглядаюць гаспадыні з Чамялоў. Пражывае ў вёсцы цяпер 129 чалавек. З усіх сацыяльных устаноў, як было сказана, засталася крама. А цяпер ёсць і гэты дом, які замяніў і клуб, і ФАП. Машына бібліятэкі са сваім перасоўным фондам таксама не мінае гэту ўстанову. Калі праводзілі свята вёскі, то артысты выкарыстоўвалі хату як касцюмерны і грымёрны пакой.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Івацэвіцкі раён.*

**Старшыня Вулькаўскага сельскага Савета Ігар КАРПОВІЧ** расказаў, што для вёскі такая ўстанова вельмі патрэбная. Цяпер ужо і ўявіць цяжка, што не было куды зайсці прадстаўнікам любой службы, калі яны наведвалі Чамялы, хіба толькі на вуліцы стаяць. А так і на дзень вёскі, і на інфармацыйны дзень, калі прыязджаюць спецыялісты з раёна, не сорамна сабрацца і пагаварыць з вяскоўцамі. Сюды ж заходзіць і мясцовы фермер Віктар Горбач, калі трэба вырашыць якое пытанне. Вяскоўцы ўдзячныя Віктару Барысавічу за дапамогу ў апрацоўцы прысядзібных участкаў. Калі трэба бульбу пасадзіць і выкапаць, цяпер звяртаюцца да яго.

**Старшыня Івацэвіцкага раённага Савета Аляксандр САРОКА** падкрэсліў:

— Вельмі важна мець такога лідара ў вёсцы, як Ганна Мікалаеўна Емельяновіч. Яе людзі паважаюць, да яе прыслухоўваюцца. Яна, як бачыце, і сама ўмее вырашаць арганізацыйныя пытанні, здолела знайсці патрэбны дом і дамовіцца з гаспадарамі. Ну і жанчыны ў вёсцы жывуць дружныя, парадак у доме падтрымліваюць, ім не трэба нагадваць альбо кантраляваць. Гэта і ёсць парасткі сапраўднага самакіравання: арганізаваліся і зрабілі добрую справу для сябе, для камфорту ўсёй вёскі.



**Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте**

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) | | |
|---|---|---|---|
| | лот № 1 | лот № 2 | лот № 3 |
| | **в районе ул. Гоголя, 42, 42/1, 44, 46/1** в г. Бресте, на земельном участке площадью 0,3292 га | **в районе ул. Карла Маркса, 90, 92, 94** в г. Бресте, на земельном участке площадью 0,3226 га | **в районе ул. 17 сентября, 39 и ул. Советских пограничников, 28** в г. Бресте, на земельном участке площадью 0,7613 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | право проектирования и строительства многоквартирных жилых домов с объектами административно-офисного назначения | право проектирования и строительства многоквартирного жилого дома с объектом общественного питания и бытового назначения на 1-м этаже | право проектирования и строительства группы многоквартирных жилых домов с объектами соцкультбыта на 1-м этаже |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | объекты недвижимости КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», КПУП «Брестводоканал», граждан Республики Беларусь | объекты недвижимости КУП «ЖРЭУ г. Бреста», граждан Республики Беларусь | объекты недвижимости КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», КУПП «Брестское котельное хозяйство», РУП «Брестэнерго», граждан Республики Беларусь |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **49 360,88** | **48 591,27** | **114 077,60** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 9 870,00 | 9 710,00 | 22 810,00 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | **9 079,39** | **5 839,37** | **10 184,65** |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)** | **447 070,00** *(на 28.03.2019 г.)* | **249 700,00** *(на 12.04.2019 г.)* | **768 630,00** *(на 16.04.2019 г.)* |

**Организатор торгов — КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», тел. 53-81-92**

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта, а также возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которой определяется до аукциона и фиксируется в соответствующей ведомости ознакомления участников);
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

- заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений после совершения оплаты соответствующих сумм, но не позднее двух рабочих дней;
- в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 — **2 550,00 рублей**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем —** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом —** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) —** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Аукцион состоится 18 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал (либо каб. 607). Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 17.05.2019 г. до 17.30 12.06.2019 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб.,вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.** Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by

**Извещение о проведении 18 июня 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»**

Сведения о продаваемом имуществе:

| Лот | Информация о предмете торгов | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| № 1 | Прогулочный моторный катер SEA RAY Sundancer – 335 | 148 448,08 | 2 968,96 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор аукциона:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.

Торги проводятся в форме *открытого аукциона* в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию Свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23-BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник не согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение **60 календарных дней** со дня проведения аукциона.

**Торги проводятся 18 июня 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляется с 17.05.2019 г. по 14.06.2019 г. включительно, в рабочие дни с 8.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by.

Телефоны для справок: организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM MTS 8 (029) 816-64-46, GSM VEL 8 (044) 540-64-46

| |
|---|
| Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе |
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-39158 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 238 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 3. Капитальное строение, инв. № 430/С-39158, является историко-культурной ценностью |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 424350100001000538, площадью 0,0438 га (назначение – обслуживание здания магазина) по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 3 |
| Начальная цена продажи – 98 550 р. (девяносто восемь тысяч пятьсот пятьдесят рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 9 855 р. (девять тысяч восемьсот пятьдесят пять рублей) |
| Продавец – Открытое акционерное общество «Детский мир РТ», 231400, г. Новогрудок, пл. ленина, 1, Тел. 8-01597-206-10 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия проведения аукциона – сохранение историко-культурной ценности объекта. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 29 мая 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 01.12.2018 г. |
| **Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 24 мая 2019 г. до 15.00** |
| *Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/* |

Настоящим ОАО «Торговый центр «Уручье», информирует, что на основании решения внеочередного общего собрания акционеров от 15.05.2019 года **принято решение о начале процесса реорганизации Открытого акционерного общества «ТОРГОВЫЙ ЦЕНТР «УРУЧЬЕ»** (Юридический адрес: 220141, г. Минск, ул. Руссиянова, д. 36, комн. 32; почтовый адрес: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, д. 25 (5-й этаж)) **путем выделения из него общества с ограниченной ответственностью.**

Договор на депозитарное обслуживание заключен с Акционерным Сберегательным банком «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк») Юридический адрес: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 18. УНП 100325912

# МАСТАК ДЛЯ КЛІМАВІЧ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)**

У музея з мастаком цеснае супрацоўніцтва. І не толькі як з аўтарам карцін, якія тут захоўваюцца. У яго багатая сямейная гісторыя, цесна звязаная з мінулым гэтага краю. Па просьбе музейных работнікаў Леанід запісаў успаміны маці пра вядомага тутэйшага пана — Камінскага. А ёй пра яго расказвала яе маці — Марыя Захараўна Давыдова, якая працавала ў пана пакаёўкай. Дагэтуль на тэрыторыі тутэйшага Клімавіцкага лікёра-гарэлачнага завода стаіць будынак з цікава аформленым фасадам. Дакладней, малюнкам унутранага інтэр'ера спіртзавода тых часоў, калі яго гаспадаром быў Камінскі. Захаваліся таксама падвальныя памяшканні, дзе настойваліся напоі.

— У багаты дом на працу бабуля трапіла зусім дзяўчынкай, гадоў у 15-16. Яна была вельмі сімпатычная, і там яе адзявалі як ляльку. У яе абавязкі ўваходзіла падаваць ежу да стала, — пераказвае словы маці мастак. — Камінскі быў вельмі багатым чалавекам, меў вялікую гаспадарку, кавалак лесу, палі, некалькі вёсак. Усе, хто на яго працаваў, не крыўдзіліся. Ён нікога не караў, плаціў добра. Бабулі, напрыклад, даваў тры рублі ў месяц. Прыстойную на той час зарплату. А яшчэ ў яго было хобі — збіраць лекавыя травы, ён нават бясплатна лячыў імі простых людзей.

## З мастацкім ухілам

Імя Леанід для сямейства Ячневых вельмі сімвалічнае. Бацька мастака, таксама Леанід, заслужаны дзеяч культуры, кампазітар, кіраўнік трох народных хароў. На будынку Клімавіцкага раённага цэнтра культуры ёсць памятная дошка з яго імем. У горадзе таксама збіраюцца назваць адну з вуліц у яго гонар.

Сын Леанід набыў вядомасць дзякуючы сваім пейзажам і нацюрмортам. А ў апошнія некалькі гадоў раскрыў у сабе талент скульптара. Дапамагае яму ў гэтым прафесійны тынкоўшчык. Бо стварэнне скульптуры з жалезабетону патрабуе не толькі мастацкага густу, але і ведання асноў лепкі. Тандэм хутка набыў папулярнасць. Адзін з пастаянных заказчыкаў — Клімавіцкі лясгас.

Чалавек з ружжом і трафеем у выглядзе кабана каля дома паляўнічага — якраз адна з першых работ мастака ў ролі скульптара. Шмат аўтарскіх вырабаў упрыгожвае сам дом паляўнічага і пасеку лясгаса. Усяго ў раёне каля 30 ячнеўскіх скульптур — вікінгі, мядзведзі, розныя кампазіцыі. Адзін прыватнік папрасіў яго зрабіць перад домам вялікую пячору, перад уваходам у яе прыступкі, на якіх сядзіць ваўчыная сямейства.

На ўездзе ў Клімавічы, дзе знаходзіцца свінакомплекс, можна ўбачыць яшчэ адзін цікавы праект. Адна свіння стаіць на бочцы, другая ляжыць насупраць, задраўшы ўгору капыткі, трэцяя красуецца на подыуме — гэтакая каралева прыгажосці. Гледзячы на ўсё гэта сямейства, пачынаеш міжволі ўсміхацца, настрой з'яўляецца. Не дзіўна, што тут пастаянна праводзяцца фотасесіі.

— Такія скульптуры ўжо даўно карыстаюцца попытам у бліжэйшым замежжы. У нас жа яны толькі набіраюць папулярнасць, — адзначае Леанід Ячнеў. — Мой калега з Украіны на гэтым нават бізнес зрабіў.




**Леанід Ячнеў і яго сонечныя скульптуры.**

Інфармацыя пра аўтара малых архітэктурных формаў хуценька разнеслася па наваколлі. Цяпер заказы паступаюць нават з найбліжэйшых да Клімавіч раёнаў Расіі. Нядаўна Ячнеў ездзіў туды да гаспадара аграсядзібы, які папрасіў зрабіць лесавіка. Жадае, каб скульптура стаяла на ўваходзе і сустракала гасцей. Потым, магчыма, непадалёк з'явіцца паляна з грыбамі і нешта іншае на лясную тэматыку. А яшчэ мастака чакаюць у Стаўбцах у Мінскай вобласці. Там трэба зрабіць вялікі штучны вадаспад вышынёй метры чатыры і даўжынёй метраў сем, а побач — вадаём. Народ актыўна ўпрыгожвае свае аграсядзібы і стараецца давяраць гэта не абы-каму. Балазе, у інтэрнэце шмат інфармацыі пра Ячнева і яго работы.

## Клімавічы ў фарбах

Скульптура — гэта спосаб зарабіць на жыццё, прызнаецца мастак, а вось жывапіс — сэнс існавання на зямлі. На жаль, на карціны цяпер меншы попыт. Але ён пастаянны ўдзельнік шматлікіх творчых міжнародных і айчынных праектаў. Нядаўна яго работы можна было пабачыць на выстаўцы «Мой родны кут» у Магілёве, у якой прымалі ўдзел майстры Саюза мастакоў Беларусі. Вельмі цікавым стаў вопыт удзелу ў пленэрах «Руская Атлантыда», якія Санкт-Пецярбургскі цэнтр гуманітарных праграм і Саюз мастакоў Расіі ладзяць у Ніла-Сталабенскай пустыні. Сюды прыязджаюць прафесіяналы з розных куткоў Расіі і іншых краін і некалькі дзён працуюць у розных манастырах. Кожны год Ячнеў наведвае міжнародны пленэр у расійскіх Шумячах, прысвечаны лаўрэату Сталінскай прэміі Фёдару Шурпіну. Ячнеўскія пейзажы кранаюць цёплымі вясковымі матывамі, у іх шмат глыбіні, прасторы, паветра. Яму падабаецца вяртацца ў мінулае роднага горада і аднаўляць ягоную прыгажосць у фарбах. Амаль завершана работа над карцінай, на якой выяўлены куточак Клімавіч пачатку XX стагоддзя.

— Маці расказвала, што раней у парку стаяла старая драўляная царква, якая дзейнічала яшчэ да вайны, — дзеліцца гісторыяй яе стварэння Леанід Ячнеў. — Музейшчыкі кажуць, што гэта была царква Іаана Прадцечы. Пасля вайны з яе знялі купалы і зрабілі кінатэатр. Там мая маці працавала касірам да 1958 года, пакуль не пабудавалі Дом культуры. А царкву непрыкметна разабралі. Я напісаў карціну па расказах маці і яшчэ нікому яе не паказваў. Для нашага сямейства гэта царква — месца наогул знакавае. Там быў і клуб, дзе толькі пачынаў працаваць мой бацька.

Глядзіш на карціну, і на душы становіцца цёпла і ўтульна, хоць на палатне зімовы пейзаж. Грэе мяккае лагоднае святло, якое струменіцца з вокнаў і дзвярэй царквы. Ідзе служба, і ўсё наваколле сціхае, быццам прыслухоўваецца да ўрачыстай літургіі.

**Старшыня Клімавіцкага райсавета дэпутатаў Васіль ЗАХАРЭНКА:**

— Навядзенне парадку на зямлі — адна з галоўных задач для кожнага жыхара нашага раёна. І малыя архітэктурныя формы надаюць населенаму пункту непаўторную асаблівасць. Тым больш калі іх аўтар — прафесіянал. Нашы прадпрыемствы ахвотна заказваюць у Леаніда Ячнева розныя скульптуры, каб прыцягнуць увагу да сваіх аб'ектаў. Прыемна, што землякі не застаюцца ўбаку ад спраў раёна, прымаюць удзел у яго развіцці. На рэспубліканскім суботніку два нашыя знакамітыя ўраджэнцы — Валерый Іваноў і Іван Кажамяка — дапамагалі ўпрыгожваць горад, саджалі туі на ўездзе ў яго. Яшчэ адзін наш зямляк Мікалай Крупінін стварыў у Селішчы базу агра-экатурызму і працягвае развіваць гэты населены пункт, рабіць яго ўсё больш прывабным і камфортным для адпачынку. Добраўпарадкаваў невялікую сажалку, прыводзіць да ладу парк, збіраецца зрабіць дзіцячую пляцоўку. У нас, дарэчы, існуе клуб ганаровых землякоў, яго члены паступова становяцца ганаровымі грамадзянамі. Сярод апошніх, хто атрымаў гэты высокі статус, — Мікалай Крупінін і Іван Кажамяка. Гэтыя людзі дапамагаюць вырашаць надзённыя праблемы для раёна. І мы імі вельмі ганарымся.



**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# СОКАЛЫ, ЭКЗОТЫ, ПАЧУЦЦІ

## Якія новыя маршруты былі створаны летась?

Сакаліны — адзіны спецыялізаваны заказнік па захаванні сокала-пустальгі ў Беларусі. Магчыма, адзіны ў Еўропе — у іншых краінах гэтая птушка любіць сяліцца на дамах. Стварэнне заказніка ініцыявалі мясцовыя жыхары, ім нават даводзілася супрацьстаяць вырубцы дрэў у любімым парку, дзе гняздуюцца рэдкія птушкі. Але гэтая тэрыторыя нікім фінансава не падтрымліваецца, і, каб вырашаць пэўныя праблемы, якія звязаны з яе аховай, грамадская арганізацыя «Цэнтр экалагічнага выхавання і развіцця» і Мачулішчанскі пасялковы выканкам запусцілі ўнікальны праект «Мачулішчы: экасупольнасць людзей, сокалаў і сасноў». Каб сабраць і актывізаваць мясцовае насельніцтва, якое будзе дапамагаць захоўваць гэтую тэрыторыю, вырашана было стварыць экасцежку. Падчас падарожжаў па ёй у пэўныя дні (канец сакавіка — пачатак красавіка) вы без праблем убачыце рэдкіх птушак. А калі далучыцца да актывістаў, можна нават паўдзельнічаць у майстар-класах па пляценні кошыкаў — гнёздаў для сокалаў — альбо да кампаній па барацьбе з інвазійнымі раслінамі і пасадкі чырванакніжнікаў. І, як заўважыў кіраўнік праекта Руслан Шайкін, новая экасцежка закрывае патрэбы ўстаноў адукацыі, сюды з задавальненнем прыходзяць школьнікі.

Гэты праект рэалізаваны дзякуючы падтрымцы Еўрапейскай асацыяцыі мясцовай дэмакратыі — ALDA і грамадскаму аб'яднанню «Фонд імя Льва Сапегі» ў межах праграмы «ТАНДЭМ IV» .

* * *

Мясцовы фонд развіцця «Старт-Усход» (Магілёўская вобласць, Краснапольскі раён, в. Брылёўка) і Краснапольскі раённы савет дэпутатаў змаглі выйграць грант на стварэнне «Экатура ў «Шангры-Ла». Гэты турыстычны маршрут будзе цікавы аматарам рэдкіх раслін — у вёсцы Брылёўка яны змогуць пабачыць унікальны дэндрапарк, створаны рукамі аматара Івана Зотава. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў ён прывозіў на малую радзіму расліны з розных мясцін і садзіў спачатку на ўласным участку, а пасля і за яго межамі. На тэрыторыі каля дзесяці гектараў прыжылася і акліматызавалася 77 відаў экзатычных раслін. На жаль, Івану Ізотавічу ўжо цяжка даглядаць сад, і на дапамогу яму прыйшлі мясцовыя школьнікі. За грошы, атрыманыя ў межах праекта, удалося паставіць агароджу, альтанку і размясціць побач з рэдкімі раслінамі інфармацыйныя таблічкі.

* * *

У заказніку «Азёры» была адкрыта экалагічная сэнсарная сцежка. Гэты маршрут адаптаваны пад людзей з парушэннямі зроку — абапал размешчаны вяровачныя поручні, дзякуючы чаму людзі нават са страчаным зрокам могуць перамяшчацца самастойна.

Падчас такога падарожжа госці заўважаць, што сцежка пакрытая рознымі матэрыяламі. Пясок і дробны камень змяняюць дранка, бярвёны, шышкі. На інфармацыйных стэндах наведвальнікі могуць дакрануцца да спілаў розных парод дрэў, узораў галінак і шышак, а таксама адчуць пах розных раслін. А каб напоўніць сцежку гукамі, тут развешаны дамкі для птушак.

Закуплены аўдыягіды і абсталяванне, каб друкаваць буклеты для людзей, якія маюць праблемы са зрокам. Спецыялісты заказніка прайшлі навучанне пра асаблівасці працы з гэтымі групамі. Таксама тут праводзіліся заняткі для будучых гідаў з парушэннямі зроку. Чаму б тым, хто слаба бачыць, не праводзіць экскурсіі для людзей з татальнай стратай зроку?

* * *

Смаргонскі мясцовы дабрачынны фонд «Паўночныя Афіны М. К. Агінскага» ў супрацоўніцтве з Залескім сельскім Саветам распрацаваў веламаршрут «Невядомая вайна вачыма нашчадкаў», падчас якога моладзь зможа больш даведацца пра Першую сусветную вайну. Так, менавіта на Смаргоншчыне была ўпершыню выкарыстана хімічная зброя. У памяць пра ўсіх, хто загінуў у той вайне, мясцовыя жыхары разам са школьнікамі пасадзілі сквер. Трэба сказаць, што гэты праект, таксама рэалізаваны ў межах праграмы «ТАНДЭМ IV», меў яшчэ адну мэту — праз рэалізацыю мерапрыемстваў у галіне культурнай і гістарычнай спадчыны развіваць маладзёжнае самакіраванне.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# Пакаштаваць пернік і ўбачыць 3D-мапінг на Гальшанскім замку

## Рэгіянальны фестываль «Гальшанскі замак» пройдзе X раз. Арганізатары запрашаюць наведаць яго заўтра, у суботу, 18 мая

**Цікавы сваімі міфамі і легендамі замак роду Сапегаў у Гальшанах прапануе прыхільнікам сярэднявечнай культуры, аматарам рыцарскіх турніраў і народных рамёстваў прыняць удзел у мерапрыемстве, паведамляе «Ашмянскі веснік».**



— Акрамя абноўленай Паўночнай вежы замка, гасцей свята чакае мноства сюрпрызаў і падарункаў, — запэўніваюць арганізатары, — незвычайны будзе віртуальная экскурсія і выстаўка «Наша гісторыя ў стэрэавыявах», а таксама дэманстрацыя 360-градусных панарам Гальшанскага замка.

Распачне фестывальны дзень тэатралізаваны пралог «Сапега праз стагоддзі вітае гасцей». А ўрачыстае адкрыццё пачнецца з дэгустацыі знакамітага гальшанскага перніка і выступлення гурта «Стары Ольса». Дзённую праграму працягне тэатралізаванае коннае шоу «Крылатая слава Гальшанскіх зямель» конна-гістарычнага клуба «Залатая шпора» і мінскага ваенна-гістарычнага клуба «Секерж». Выдатным падарункам для усіх гасцей фестывалю стануць турніры лучнікаў з выкарыстаннем 3D-мішэняў, а таксама паказальныя выступленні клуба гістарычнай рэканструкцыі «Шатландская пяхота».

На пляцоўцы «Рыцарскі стан» каля сцен замка збяруць сваіх прыхільнікаў рыцарскія турніры і бугурты — гэта адно з самых займальных відовішчаў свята. Вулічны статычны тэатр «Вір» навучыць на майстар-класе хадзьбе на хадулях.

Чароўнасць харэаграфічнай культуры мінулага прадэманструюць танцавальныя калектывы SOLEIL і 1410. А ўдзельнікаў вячэрняй праграмы фестывалю чакае незабыўная музычная імпрэза вядомых гуртоў сярэднявечнай музыкі «Літы Талер», Nevrida і PAWA. Яскравае тэатралізаванае фаер-шоу пакажа тэатр «Вір». Незабыўным відовішчам стане 3D-мапінг на сценах Паўночнай вежы. Завершыцца фестываль яркім феерверкам.

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

# ЯК СПЫНІЦЬ СМЕЦЦЯВОЗ?

Што рабіць, калі з уласнага акна вы бачыце не зялёны двор, а дзясятак кантэйнераў са смеццем і газон, спаласаваны коламі грузавікоў? «Мы станавіліся грудзямі перад смеццявозамі, якія, каб сэканоміць час і паліва, ехалі праз двор, клалі каменныя слупы... А яны іх аб'язджалі і, як усюдыходы, прабіраліся па кустах... І мы нічога іншага не маглі прыдумаць, як арганізаваць дзіцячую пляцоўку на месцы, дзе ездзяць машыны», — расказвае **Наталля ПАРЭЧЫНА, каардынатар праекта «Добрасуседства» — зробім двор сваёй мары разам!», падтрыманага ў межах праграмы «ТАНДЭМ IV».** Але толькі адным добраўпарадкаваннем тэрыторыі актывісты не абмежаваліся. Праект перарос у сапраўдную інфармацыйную кампанію супраць смецця. Грамадская арганізацыя «Цэнтр экалагічных рашэнняў» праводзіла заняткі са школьнікамі рознага ўзросту. Дзеці даведваліся пра сартаванне адходаў, самі распрацавалі спецыяльныя налепкі з інфармацыяй пра тое, якім павінна быць змесціва каляровых кантэйнераў. А што можа быць лепшым урокам у абарону чысціні і парадку, чым акцыі, на якіх дзеці побач з бацькамі «варожаць» над ператварэннем іх дворыка ў цудоўную ўтульную мясціну?

«Пасёлак Гатава быццам і недалёка знаходзіцца ад Мінска — 10 кіламетраў ад кальцавой, — а жылі мы там куды горш», — дзеліцца Наталля. Але, як аказалася, нават з невялікімі сродкамі можна шмат зрабіць. Былі б толькі людзі, якія не чакаюць, пакуль нехта вырашыць іх праблемы. На першы сход, на якім абмяркоўваліся пытанні па добраўпарадкаванні прыдваровай тэрыторыі, прыйшлі 43 чалавекі! У межах праекта было закуплена абсталяванне для дзіцячых пляцовак, трэнажоры, а ўсе работы ўзвалілі на сябе неабыякавыя жыхары пасёлка. Дапамогу аказала і камунальнае прадпрыемства.

Таксама ў межах праграмы «ТАНДЭМ IV» падобны праект быў рэалізаваны ў Слоніме. Мясцовае грамадскае аб'яднанне ўстойлівага развіцця «Мінолс» і экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі таксама паказалі грамадскасці, што разам можна змяніць свет навокал. Жыхары горада разам з актывістамі абсталёўвалі дзіцячую пляцоўку, саджалі дрэвы і кусты. У будучыні ў горадзе плануюць зрабіць пляцоўку, на якой можна будзе не толькі выгульваць і дрэсіраваць сабак, але і рабіць выстаўкі розных жывёл.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ПЛАВАЛІ — ВЕДАЕМ!

## На беларуска-ўкраінскім Палессі з'явілася 20 грамадскіх экалагічных пастоў

**Гідрахімічныя аналізы, прыборка берагоў і стварэнне дапаможніка па вывучэнні рэк — на Пінshчыне пазакласныя заняткі ў гэтым навучальным годзе былі якімі заўгодна, толькі не нуднымі. Каля двухсот школьнікаў і настаўнікі Пінскага і Любяшоўскага (Украіна) раёнаў сочаць за станам малых рэк Прыпяці.**

Дзякуючы праекту «Трансгранічныя водныя інспектары: на шляху да сумеснага маніторынгу і засваення водных рэсурсаў ракі Прыпяць» створана дзесяць грамадскіх экалагічных пастоў з боку Беларусі і дзесяць — з боку Украіны. Адзін пост — адна школа і рака (ці возера), за чыім станам вядзецца назіранне.

Для аналізу вады з рэк у хлопцаў і дзяўчат ёсць кампактныя хімлабараторыі, а вынікі запампоўваюцца на сайт. Падчас кампаній па ачыстцы берагоў удзельнікі праекта здолелі сабраць прыкладна паўтары тысячы літраў смецця!

Партнёры праекта адкрылі новы водаправод у вёсцы Заполле Пінскага раёна — сетка даўжынёй 615 метраў, а ў Любяшоўскім раёне з'явілася новая пляцоўка для адпачынку. Праект «Трансгранічныя водныя інспектары» суфінансаваўся Еўрапейскім саюзам у рамках Праграмы тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краін «Усходняга партнёрства» і рэалізоўваўся з чэрвеня 2018 года да сакавіка 2019-га.

Юныя водныя інспектары працягнуць сачыць за станам малых рэк і пасля завяршэння праекта.

**Варвара МАРОЗАВА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 16 мая 2019 года.**